ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Год выдання 36-ы
№ 72 (2226)
12 верасня 1967 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

АБЛАСЦЯМ БЕЛАРУСІ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Да 50-годдзя Савецкай улады Мінская студыя хранікальна-дакументальных і навукова-папулярных фільмаў рыхтуе серыю кіначасопісаў і нарысаў, прысвечаных абласцям Беларусі. Першы часопіс, прысвечаны Брэсту і Брэсцкай вобласці, ужо выйшаў. Ён апавядае пра тых, хто рабіў рэвалюцыю і змагаўся на франтах Вялікай Айчыннай вайны, пра новабудоўлі Брэстчыны, пра калгасы і саўгасы. Рэжысёр часопіса В. Дашук, аператары Ю. Іванцоў, С. Фрыд, Я. Сакалоў, Ф. Осіпаў.

Экспанаты музея, адкрытага ў сельгасарцелі імя Ул. Царука Карэліцкага раёна — летапіс калгаснай вёскі. Яны расказваюць пра цяжкое падняволнае жыццё сялян пры старым ладзе, пра тых, хто са зброяй у руках змагаўся за ўладу Саветаў, пра слаўныя справы народных мсціўцаў у часы Айчыннай вайны і іх камандзіра Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Зянонавіча Царука, пра мірную самаадданую працу хлебаробаў...

Таму ў калгасным музеі бывае шмат народу. Вось і здымак фотакарэспандэнта БЕЛТА А. Перахода адлюстраваў момант, калі прыйшла чарговая экскурсія. Пра мінулае і сённяшняе калгаса расказвае выкладчыца гісторыі Яроміцкай сярэдняй школы А. М. Мацук.

ОПЕРА АДКРЫВАЕ СЕЗОН

9 верасня Дзяржаўны ордэна Леніна акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларускай ССР адкрыў новы тэатральны сезон. Мінчане ўбачылі ў гэты дзень оперу К. Малчанава «Брэсцкая крэпасць» і балет А. Глебава «Альпійская балада», прысвечаныя гераічнай барацьбе савецкага народа супраць фашысцкіх захопнікаў.

Карэспандэнт газеты «Літаратура і мастацтва» папрасіў галоўнага дырыжора тэатра Г. Дугашава расказаць, чым адметны гэты сезон для калектыву, над чым працуе зараз тэатр, чым ён сустрэне 50-годдзе Савецкай улады.

— Сезон юбілейнага года для нас пачаўся, па сутнасці, яшчэ ў красавіку, — сказаў Газіз Ніязавіч, — калі мы ўслед за операй Я. Цікоцкага «Алеся» выпусцілі яшчэ два спектаклі на тэму гераічнага змагання нашага народа. Іх ужо ўбачылі і па вартасці ацанілі гледачы. Гэта — «Брэсцкая крэпасць» і «Альпійская балада».

Цяпер тэатр працуе над операй Ю. Семянякі «Калі ападае лісце» — пра жыццё вучоных. Аўтар лібрэта — паэт Алесь Бачыла. Дырыжор І. Абраміс, рэжысёр У. Станкевіч, мастак А. Салаўёў. У гэтым спектаклі будуць заняты вядучыя салісты тэатра — Р. Асіпенка, С. Данілюк, П. Дружына, А. Саўчанка, А. Сухін, В. Чарнабаеў, І. Шыкунова, Т. Шымко і інш.

Прэм'ера прысвячаецца юбілею Кастрычніка.

Балетны спектакль «У імя жыцця» — аб станаўленні Савецкай улады ў Сібіры таксама неўзабаве ўбачыць святло рампы. Музыку напісаў маскоўскі кампазітар А. Лапуцін. Пастаноўка галоўнага балетмайстра тэатра А. Дадзішкіліяні. Ён жа ставіць балет Г. Вагнера «Пасля балю». Першым балетам дырыжыруе я, другім — Т. Каламійцава. Абодва спектаклі мы мяркуем паказаць мінчанам яшчэ да канца года.

Такім чынам, у юбілейным сезоне гледачы ўбачаць на нашай сцэне шэсць новых спектакляў.

У сёлетнім сезоне будуць адноўлены спектаклі, якія раней упрыгожвалі афішу нашага тэатра. Гэта — «Пікавая дама» Чайкоўскага і «Тоска» Пучыні. У новай пастаноўцы пойдзе таксама «Багема».

— Раскажыце, калі ласка, якія новыя творчыя сілы ўліліся ў калектыў тэатра, чые дэбюты мы ўбачым сёлета?

— Дэбютаў, па сутнасці, не прадбачыцца. Бо наша моладзь паспела ўжо зарэкамендаваць сябе ясной. Вялікія спадзяванні мы ўскладаем на выпускніка Кішынёўскай кансерваторыі А. Сухіна, які выступіў у партыі Канчака ў оперы «Князь Ігар», а таксама на былога студэнта нашай Беларускай кансерваторыі М. Галкоўскага, які пасля Сяргея ў «Алесі» спяваў Пінкертона ў «Чыо-Чыо-Сан». Ну і вядома ж, на С. Данілюк, якую мінчане ўжо слухалі ў «Алесі». Сярод навічкоў у балеце вылучаюцца выпускнікі Беларускага харэаграфічнага вучылішча Л. Бжазоўская, якая справілася з адказнай партыяй Сольвейг у «Пер-Гюнце» і Я. Паўловіч, які дэбютаваў у «Лебядзіным возеры».

Спадзяёмся, што новы рэпертуар адкрые і новыя яркія імёны.

Мы сардэчна запрашаем мінчан на нашы спектаклі.

ПАКАЖА ВАГОН-ВЫСТАЎКА

Гэты вагон, які стаіць на рэйках Мінскай пасажырскай, знешне нічым не адрозніваецца ад іншых. Але гэта вагон спецыяльнага назначэння. У ім разгорнута выстаўка «Партыя — наш рулявы», падрыхтаваная Дзяржаўным музеем рэвалюцыі СССР і Дзяржаўным музеем Беларускай ССР. Выстаўка складаецца з 35 планшэтаў. Мовай фотадакументаў яна расказвае пра этапы вялікага шляху, пройдзенага нашай краінай за 50 год. Па гэтых дакументах можна прасачыць увесь шлях Савецкай дзяржавы.

Асаблівую цікавасць уяўляюць матэрыялы, што ўвасабляюць рэвалюцыйныя падзеі ў Беларусі. Тут можна пазнаёміцца з загадам № 1 Выканаўчага камітэта Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, убачыць фатаграфію В. І. Пралыгіна — каменданта бронепоезда, які прыбыў у пачатку лістапада семнаццатага года ў Мінск для падаўлення контрэвалюцыйных сіл, фотаздымак агітцягніка «Кастрычніцкая рэвалюцыя», на якім Міхаіл Іванавіч Калінін пабываў у Бабруйску. Цікавыя дакументы расказваюць пра гады індустрыялізацыі і калектывізацыі, паказваюць камуністаў на будоўлях пяцігодак, на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

Маршрут вагона арыентыровачна ўжо складзены: ён будзе праходзіць такім чынам, каб з выстаўкай магло пазнаёміцца насельніцтва найбольш аддаленых раёнаў Мінскай, Гродзенскай і Віцебскай абласцей. Жыхары станцыйных пасёлкаў і калгаснікі змогуць паслухаць лекцыі і гутаркі, з якімі выступіць загадчык аддзела навуковай прапаганды Дзяржаўнага музея Беларускай ССР С. Разумнікаў. Будуць таксама наладжаны сустрэчы са старымі бальшавікамі, удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, героямі працы.

Хутка вагон-выстаўка адправіцца ў двухмесячнае перад юбілейнае падарожжа.

НОВЫЯ НАРОДНЫЯ

За шматгадовую творчую дзейнасць і высокае выканаўчае майстэрства калегія Міністэрства культуры БССР прысвоіла ганаровае званне «Народны тэатр» драматычнаму калектыву Жлобінскага раённага Дома культуры Гомельскай вобласці, драматычнаму калектыву Целяханскага гарадскога Дома культуры Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці і драматычнаму калектыву Лідскага гарадскога Дома культуры Гродзенскай вобласці. Ансамблю песні і танца Смаргонскага раённага Дома культуры прысвоена званне «Народны ансамбль песні і танца».

□

Тэатральны калектыў Жлобінскага раённага Дома культуры (кіраўнік — Э. Яфімава) створаны ў 1959 годзе. У ім — 20 чалавек. Актыўныя ўдзельнікі калектыву — М. Кудрашоў, П. Кірычэнка, Е. Кайкова, Я. Закржаўскі, В. Маханькоў і іншыя.

Спачатку драматычны калектыў ставіў аднаактовыя спектаклі. Новым этапам у яго творчай біяграфіі з'явілася пастаноўка п'есы А. Астроўскага «На бойкім месцы», якая была паказана па тэлебачанню.

На рэспубліканскім фестывалі самадзейнага тэатральнага мастацтва, прысвечаным 50-годдзю Вялікага Кастрычніка, калектыў быў узнагароджан дыпломам III ступені за спектакль «Іголка і штык» А. Галіева. Зараз калектыў працуе над спектаклем «Жаніцьба» М. Гогаля.

□

Самадзейны драматычны гурток Целяханскага Дома культуры Івацэвіцкага раёна створаны ў 1948 годзе. Спачатку гэта быў невялічкі гурток аматараў тэатральнай самадзейнасці. Цяпер жа ў ім — каля 50 чалавек. Гэта дае магчымасць працаваць паралельна над двума спектаклямі. Кіруе калектывам настаўніца Л. Уліціна. Ёй дапамагае ставіць спектаклі мастацкі кіраўнік Дома культуры М. Крынец. Старэйшыя аматары самадзейнай сцэны — пенсіянер М. Дзягцярык, шафёр М. Вікторовіч, настаўнік А. Самулевіч і іншыя. У рэпертуары калектыву «Паўлінка» і «Прымакі» Я. Купалы, «Несцерка» В. Вольскага, «Перад вызваленнем» П. Пестрака, «Не верце цішыні» І. Шамякіна, Шпачок» А. Махнача, «Папарацькветка» І. Козела.

Да 50-годдзя Савецкай улады калектыў рыхтуе два спектаклі: «Змацаваныя крывёю» М. Гарулёва і «Год дзевяцьсот семнаццаты» П. Васілеўскага.

На рэспубліканскім фестывалі самадзейнага тэатральнага мастацтва, прысвечаным 50-годдзю Вялікага Кастрычніка, калектыў быў узнагароджаны дыпломам III ступені за спектакль «Папарацькветка» І. Козела.

Тэатральны калектыў Целяханскага Дома культуры абслугоўвае хлебаробаў не толькі свайго раёна, але і Пінскага, ён паказваў свае спектаклі ў Брэсце і Пінску.

□

Дваццаць год назад нарадзіўся драматычны калектыў Лідскага гарадскога Дома культуры (рэжысёр Д. Альпяровіч). У калектыве — 21 чалавек. Гэта людзі розных узростаў і прафесій — педагогі, інжынеры, рабочыя, служачыя, студэнты.

Рэпертуар яго складаецца са спектакляў рускай класікі і савецкай драматургіі: «Лес» і «Без віны вінаватыя» А. Астроўскага, «Платон Крэчат» А. Карнейчука, «Шасцёра любімых» А. Арбузава, «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы, «Барабаншчыца» А. Салынскага, «Не верце цішыні» І. Шамякіна, «Над хвалямі Серабранкі» І. Козела, «Слава» В. Гусева. Цяпер калектыў пачаў працаваць над спектаклем «Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча, які прысвячае юбілею Савецкай улады.

На рэспубліканскім фестывалі самадзейнага тэатральнага мастацтва калектыў быў узнагароджаны дыпломам II ступені за спектакль «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы.

□

Смаргонскі ансамбль песні і танца імя Агінскага быў створаны ў 1964 годзе на базе харавога і танцавальнага калектываў. І хор, і танцавальны калектыў удзельнічалі ў абласных і рэспубліканскіх аглядах.

Ансамбль — новая ступень у творчым развіцці і станаўленні калектыву. Вялікую дапамогу ў яго арганізацыі аказалі заслужаныя дзеячы культуры БССР А. Шыдлоўскі і Я. Хвораст.

Аснову рэпертуару ансамбля складаюць народныя творы. Вядома, што на Смаргоншчыне ў свой час жыў польскі кампазітар Агінскі. Яго паланез «Развітанне з радзімай» адкрывае праграму выступлення самадзейных артыстаў у форме вакальна-харэаграфічнай кампазіцыі. Аўтар тэксту і пастаноўшчык танца — балетмайстар Я. Хвораст. Мясцовы фальклор узбагачае рэпертуар калектыву, надае яму самабытнасць, глыбока народны характар.

Цяпер у ансамблі 110 чалавек — рабочыя, служачыя, інтэлігенцыя горада Смаргоні. Кіраўнік хору — А. Гецэвіч, танцавальнай групай кіруе С. Федаровіч.

Смаргонскі ансамбль з вялікім поспехам выступаў у Маскве на сцэне Крамлёўскага тэатра, у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы і ў Польскай Народнай Рэспубліцы.

З НОВЫХ ПЛАКАТАЎ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ. І. РАДУНСКІ. Подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці неўміручы!

ПУЛЬС ТВОРЧАСЦІ

Расціслаў БАБІЙЧУК,
міністр культуры Украінскай ССР

З тае пары, як гадзіны гісторыі пачалі адлічваць новы, савецкі час, у культурным жыцці ўкраінскага народа адбыліся вялікія пераўтварэнні.

Амаль непісьменная Украіна стала рэспублікай высокай сацыялістычнай культуры і ўсеагульнай адукацыі. Цяпер з кожных ста працуючых 54 маюць вышэйшую або сярэднюю адукацыю. Да рэвалюцыі тут не было ні музеяў, ні палацаў культуры, ні клубаў, ні філармоній. Цяпер іх сотні, тысячы. Адных толькі масавых бібліятэк каля 30 тысяч, у іх — 466 мільёнаў кніг. Тэатраў — больш за шэсцьдзесят, 37 прафесіянальных музычных калектываў. Лічбаў такіх можна прывесці шмат. І кожная — прадмет для каментарыя.

Проза і паэзія, мастацтва тэатра, жывапіс нашых землякоў у мінулым з'явіліся дастойным укладам у развіццё сусветнай культуры. Усяму свету вядомыя імёны Шаўчэнкі, Скаварады, Франка, Лысенкі, Лесі Украінкі. І ўсё ж культура Украіны не ведае з'яў у сваёй гісторыі, якія б маглі параўнацца з рэвалюцыйнымі Кастрычніцкімі пераўтварэннямі. Упершыню ў свеце мастацтва стала магутнай зброяй працоўных у барацьбе за пабудову новага грамадства, яно развіваецца ў арганічнай сувязі з жыццём народа.

Мы шчаслівыя, што сацыялістычная культура вядзе да шырокага духоўнага ўзбагачэння працоўных. Бо толькі ў народных тэатрах Украіны, хорах, філармоніях, танцавальных калектывах, літаратурных аб'яднаннях столькі ўдзельнікаў, колькі насельніцтва ў некаторых еўрапейскіх дзяржавах. І мы не проста ўнутрана ўдасканальваемся, робімся танчэйшымі, інтэлектуальнейшымі ў сваіх учынках, поглядах, помыслах, мы вучымся дарыць свае духоўныя багацці і братам па Саюзу рэспублік, і проста сучаснікам-сябрам.

Не толькі ў нас у рэспубліцы, але і за яе межамі шырокае прызнанне атрымалі наша Маўка — балерына Іраіда Лукашова і наша Чыо-Чыо-Сан — Ламара Чконія; сімфанічныя работы дырыжора Стэфана Турчака, танцы, пастаўленыя Паўлам Вірскім, цудоўная праграма народнага хору імя Вяроўкі, якім кіруе Анатоль Аўдзіеўскі. Тысячы людзей з удзячнасцю ўспамінаюць аб канцэртах капэл — «Думкі» і «Трэмбіты», капэлы бандурыстаў.

Творчая работа ідзе не толькі ў сталічных, але і ў абласных тэатрах і мастацкіх калектывах Украіны. Сёння ўжо нікога не здзівіць, што побач з кіеўскімі на сцэне Крамлёўскага тэатра ў Маскве выступаюць вінніцкі, хмяльніцкі або львоўскі тэатральныя калектывы. Па выніках штогадовых конкурсаў на лепшыя спектаклі ў рэспубліцы за апошнія чатыры гады адзначана 24 пастаноўкі, з іх 20 — работы абласных тэатраў. Севастопальскі тэатр стаў лаўрэатам на рэспубліканскім аглядзе за спектакль па «Узнятай цаліне» Шолахава, Белацаркоўскі — за работу над творам кіргізскага пісьменніка Айтматава «Мацярынскае поле», Вінніцкі — за пастаноўку п'есы эстонскага драматурга Кіцберга «Пярэвараценъ», Хмяльніцкі тэатр і Кіеўскі акадэмічны імя Лесі Украінкі адзначаны на Усесаюзным аглядзе польскіх п'ес. Гэта яркае сведчанне ўзаемаўзбагачэння братніх нацыянальных культур.

Шматлікія творчыя лабараторыі рэспублікі — мастакоў, пісьменнікаў, кампазітараў, акцёраў — калектыўных і індывідуальных, прафесіянальных і самадзейных — перажываюць цяпер бурны працэс стварэння.

Для нашых драматургаў Карнейчука, Заруднага, Каламійца, Стальмаха, Збанацкага, Дзмітэркі, Радчанкі, Стаднюка і многіх, многіх іншых час падрыхтоўкі да пяцідзесяцігоддзя Кастрычніка — гэта час самай натхнёнай працы.

Музычная душа народа жыве ў новых творах украінскіх савецкіх кампазітараў Штагарэнкі, Губарэнкі, Клябанава, Майбарады, Філіпенкі і іншых. Кампазітары плённа працуюць над стварэннем аб'ёмных музычна-сцэнічных твораў. Паспяховыя пошукі ў сімфанічных, кантатна-аратарыяльных жанрах.

«Народ, Партыя, Камунізм!» — такі дэвіз юбілейнай мастацкай выстаўкі. У апошні час украінскія мастакі — Касіян, Дэрэгус, Божый, Бакшай і іншыя зрабілі шмат для творчага авалодання жыццёвым матэрыялам, для больш поўнага раскрыцця якасцей характару савецкага чалавека. Іх творы сталі ўпрыгожаннем музеяў Украіны, з поспехам экспануюцца на рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках, у многіх зарубежных краінах.

Напярэдадні 50-гадовага юбілею Савецкай улады на Украіне праходзяць рэспубліканскія агляды лепшых спектакляў і канцэртных праграм, лепшых роляў і лепшых выканаўцаў, агляды творчай моладзі і вучняў навучальных устаноў, якія рыхтуюць кадры нашаму мастацтву. Пераможцы прымаюць удзел ва Усесаюзным конкурсе, прысвечаным знамянальнай даце.

Хочацца сказаць аб такой цудоўнай падзеі, як юбілейны фестываль самадзейнага народнага мастацтва. Больш за тры месяцы працягваўся яго першы этап — агляд дасягненняў сельскіх і гарадскіх спевакоў, чытальнікаў, танцораў, мастакоў рэспублікі. Наступны этап — абласныя агляды-конкурсы. Вялікай папулярнасцю карыстаўся ў гледачоў заключны конкурс народных тэатраў і самадзейных тэатральных калектываў, а таксама аматарскіх кінафільмаў. За час шэсця фестывалю па рэспубліцы больш чым двухмільённая армія самадзейных артыстаў Украіны папоўнілася яшчэ 400 тысячамі ўдзельнікаў.

Аб размаху культурнага будаўніцтва ў рэспубліцы, асабліва на сяле, сведчыць няўхільнае пашырэнне сеткі культурна-асветных устаноў. За сямігодку ў гарадах і вёсках пабудавана каля пяці тысяч клубаў і палацаў культуры з памяшканнямі для бібліятэкі, пабудаваны тэатры ў дзевяці гарадах рэспублікі. А калі гаварыць аб мінулым годзе, дык больш тысячы клубаў і палацаў культуры гасцінна расчынілі дзверы перад працоўнымі.

У бліжэйшы час будзе пабудавана яшчэ восем тэатраў, бібліятэка Акадэміі навук УССР на 20 мільёнаў тамоў з кнігасховішчам, Украінскі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з панарамай абароны Кіева, рэспубліканскі Дом «Веды», дабудавана памяшканне Рэспубліканскага выставачнага павільёна выяўленчага мастацтва і музея ўкраінскага мастацтва.

Ярка і сардэчна прайшлі перадюбілейныя дэкады ўкраінскага мастацва і літаратуры ў іншых рэспубліках. З поспехам выступалі ў нас і пасланцы гэтых рэспублік. Юбілейны год наклаў на ўсё культурнае жыццё краіны атмасферу свята, і гэта свята аднолькава радаснае і для майстроў мастацтва, і для гледачоў.

(АДН).

З УЗНАГАРОДАЙ!

За заслугі ў развіцці Беларускай савецкай кінематаграфіі і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў кінарэжысёра тав. Сплашнова Сяргея Іванавіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

50 год Кастрычніка
НАСУСТРАЧ ВЯЛІКАЙ ДАЦЕ

СТАРОНКІ НЕНАПІСАНАЙ ГІСТОРЫІ

С. АШАРОВІЧ.

Пішацца гісторыя завода... Пішацца гісторыя калгаса... Як часта чытаем мы такія паведамленні. А вось ці пішацца дзенебудзь гісторыя бібліятэкі?

Між тым, як гэта многа — гісторыя кожнай бібліятэкі! Якія цікавыя старонкі развіцця культуры, факты ўздзеяння кнігі на чытачоў, выкарыстання бібліятэк для рэвалюцыйнай, грамадскай, выхаваўчай работы ўяўляе кожная з іх.

Што гэта так — яшчэ раз паказвае ў сваім артыкуле, які прапануецца вашай увазе, старэйшы бібліятэчны работнік рэспублікі С. Ашаровіч. Тэма яго артыкула — старонкі развіцця бібліятэчнай справы ў Мінску.

25 СНЕЖНЯ 1900 года ў Мінску была адкрыта публічная бібліятэка імя Пушкіна. Памяшканне было цеснае, але пры абмежаваным бюджэце разлічваць на лепшае было немагчыма. Дзейнасць бібліятэкі прыцягнула ўвагу мінскага губернатара. У 1913 годзе памочнікі кіраўніка канцылярыі Дзям'ян і Райскі, якія рабілі рэвізію ў бібліятэцы, пісалі, што «ў падборы кніг прыкметна тэндэнцыя ў прагрэсіўна-дэмакратычны бок», што «тая ж тэндэнцыя заўважаецца і ў адносінах да газет і часопісаў». Агенты губернатара вымушаны былі прызнаць за прычыну гэтага — настрой мас, выкліканыя падзеямі рэвалюцыі 1905 года і рэвалюцыйнага ўздыму 1912 года, бо нездарма ў сваіх вывадах яны пісалі: «...відавочна, загадчык бібліятэкі ў дадзеным выпадку кіраваўся густамі наведвальнікаў бібліятэкі».

Вывучэнне гісторыі бібліятэкі заслугоўвае ўвагі калектыву яе работнікаў. Цікавы аналіз абарачэння кніг, удзел прадстаўніка бібліятэкі ў першым (дарэвалюцыйным) усерасійскім бібліятэчным з'ездзе.

У 1911 годзе ў раёне Маскоўскай вуліцы была адкрыта бібліятэка імя Л. Талстога. Успаміны, якія аднаўляюць малюнкі культурнага жыцця тагачаснага Мінска, апублікаваныя ў «Зборніку ўспамінаў»,[1] прысвечаным віднаму дзеячу партыі, былому народнаму камісару аховы здароўя СССР Рыгору Камінскаму, які ўступіў у партыю ў Мінску ў 1913 годзе. У Туле (дзе ў гады грамадзянскай вайны Р. Н. Камінскі быў сакратаром губкома партыі) змаглі выдаць такі цікавы зборнік. Міжволі ўзнікае пытанне, чаму ў нас не выдаюцца падобныя кнігі, хто ў распубліцы збірае, запісвае ўспаміны па гісторыі грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Мінска?

«Мінск у тыя гады, — піша Т. Гурвіч у «Зборніку ўспамінаў», жыў параўнаўча інтэнсіўным культурным жыццём. Мы часта слухалі выступленні Верасаева, Брусава, Бальманта, ранняга Маякоўскага, крытыка Когана і іншых. Кнігі, тэатр, музыка складалі вялізны духоўны змест нашага жыцця.

Але кнігі былі розныя, і забавы розныя. Была моладзь, якая зачытвалася Арцыбашавым, Салагубам, Вярбіцкай, дэкламавала нарасперы вершы сімвалістаў...

Талстоўская чытальня была галоўным цэнтрам, асяродкам культуры, дзе збіралася моладзь. Кожны прыходзіў сюды на агеньчык, праўда па розных матывах: хто пачытаць новую кнігу, свежы часопіс (чытальняй выпісваліся «Русское богатство», «Мир божий», навукова-папулярныя часопісы і нават горкаўскі «Летапіс»).

Работніца-швачка А. Прэйс расказвае ў гэтым зборніку пра гурток па вывучэнню рускай мастацкай літаратуры, пра тое, як яна вяла работу ў падпольнай бібліятэцы на кватэры ў Р. Камінскага за чыгуначным мостам.

«Грыша даваў мне кніжкі для распаўсюджвання сярод краўцоў і кожны раз цікавіўся, каму я іх раздаю, якое ўражанне яны пакідаюць у чытача, і пры гэтым падкрэсліваў: неабходна сачыць за тым, каб чытачы па-сапраўднаму засвойвалі гэтыя кнігі, тады толькі будзе дасягнута мэта іх распаўсюджвання».

У лістападзе 1912 года адкрылася бібліятэка на Аляксандраўскай вуліцы (цяпер Горкага). І гэта бібліятэка насцярожыла чыноўнікаў губернатара, бо і яна была пэўным асветніцкім цэнтрам.

Багацеі горада хацелі прысвоіць бібліятэцы імя Аляксандра І. Чыноўнікі губернатара, якія правяралі бібліятэку, знайшлі тут «Нашу ніву». Мінскі губернатар напісаў міністру ўнутраных спраў, што ён «прызнае хадайніцтва гарадской Думы не заслугоўваючым павагі па той прычыне, што названая бібліятэка з першых дзён сваёй работы набыла напрамак, які пазбаўляе яе права насіць такую высокую назву, якую просіць прысвоіць ёй Дума». Пасля доўгай перапіскі гісторыя закончылася паведамленнем міністэрства ўнутраных спраў аб тым, што яно згодна з думкай губернатара.

Заслугоўвае ўвагі дзейнасць бібліятэк прафесіянальных саюзаў, у прыватнасці, бібліятэк саюза прыказчыкаў, служачых Лібава-Ровенскай чыгункі і некаторых іншых.

Многа марксісцкай літаратуры распаўсюджвалі падпольныя сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. Склады з нелегальнай літаратурай, з ленінскай «Искрой» знаходзіліся на Нямізе і іншых вуліцах. Адсюль пасылкі ішлі ў іншыя гарады Беларусі. Нелегальную літаратуру захоўвалі і распаўсюджвалі не толькі рабочыя, але і інтэлігенцыя і вучні. Так, у 1911 годзе пры вобыску ў аднаго вучня 6 класа гімназіі знайшлі бібліятэку нелегальнай літаратуры з 200 кніг.

Мінскія сацыял-дэмакраты выкарыстоўвалі і легальныя метады прапаганды літаратуры ў сяле. Начальнік Мінскага губернскага жандарскага ўпраўлення пісаў: «Больш сур'ёзнай прапагандай з'яўляецца дзейнасць сацыял-дэмакратаў. Камітэты праз блізкіх ім людзей сталі імкнуцца да таго, каб узняць разумовае развіццё сялянскай масы, з гэтай мэтай наладжваюць чытанні, праводзяць сярод сялян гутаркі, уздзейнічаюць на членаў таварыства цвярозасці для адкрыцця ў вялікай колькасці бібліятэк у вёсках, каб знаёміць іх (сялян — С. А.) з сістэматычным чытаннем, складзеным з кніг легальных, але з такім падборам, што таму, хто прачытае, стане відавочным безвыходнае і горкае становішча сялян, несправядлівае і амаральнае карыстанне багаццем толькі маёмасных і падтрымка апошніх урадам і ўсімі чыноўнікамі».

Дзейнасць нелегальных сацыял-дэмакратычных бібліятэк — важная і цікавая старонка гісторыі бібліятэчнай справы як у Мінску, так і па ўсёй Беларусі. На жаль, гэтае пытанне ў нас яшчэ даследавана мала.

АЛЕ ТОЛЬКІ пасля перамогі Вялікага Кастрычніка шырокія народныя масы пачалі далучацца да вялікага святла культуры. А. Луначарскі ў сваіх успамінах расказвае, што ўжо ў першыя дні пасля перамогі Кастрычніка Ул. І. Ленін гаварыў з ім пра першачарговыя задачы Народнага камісарыята асветы. Ленін падкрэсліваў: «Вялікую ўвагу я аддаю бібліятэкам... Кніга — вялікая сіла... Хутчэй трэба зрабіць кнігу даступнай масам. Нашу кнігу трэба пастарацца кінуць у магчыма большай колькасці і ва ўсе куткі Расіі».

Ажыццяўляць ленінскія запаветы перашкодзіла барацьба з іншаземнай інтэрвенцыяй і ўнутранай контрэвалюцыяй. І толькі калі Чырвоная Армія выгнала з нашай зямлі нямецкіх акупантаў, у Мінскім гарадскім аддзеле народнай асветы быў створаны пазашкольны аддзел, які займаўся арганізацыяй бібліятэк. Цяжкі гэта быў час. Кніг не хапала, а трэба было камплектаваць перасоўкі для прадпрыемстваў.

У лютым 1919 года прэзідыум Мінскага гарадскога Савета вырашыў муніцыпалізаваць кніжны гандаль. Кнігі з дзевятнаццаці кнігарань і некаторых бібліятэк былі перавезены ў цэнтральную бібліятэку імя Пушкіна. Тут было створана кнігасховішча з фондам у 32—35 тысяч кніг. Развіццём бібліятэчнай справы вельмі цікавіўся член урада А. Р. Чарвякоў. Ён, напрыклад, прапанаваў бібліятэчнай камісіі скарыстаць кніжныя фонды бібліятэк рускага грамадскага сходу, купецкага клуба і інш. для размеркавання іх паміж бібліятэкамі імя Пушкіна і Талстога, руска-яўрэйскай, чытальняй у памяць Айчыннай вайны 1812 года, польскай і беларускай чытальнямі.

Нараджаліся рабочыя клубы. У лютым 1919 года адкрыўся партыйны клуб імя Карла Маркса з бібліятэкай-чытальняй. Услед за ім — рабочы клуб імя Леніна Лібава-Ровенскай чыгункі. У ім працавала і бібліятэка-чытальня.

Пазашкольны аддзел гарана планаваў у гэты час стварыць дзіцячую бібліятэку, якая адначасова была б і музеем і дзіцячым клубам.

Вялікая падзея ў культурным жыцці рэспублікі — дэкрэт Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Савета рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў ад 25 лютага 1919 года, які абяўляў, што ў Мінску будзе адкрыт Беларускі дзяржаўны універсітэт. Адначасова пачалася падрыхтоўка да адкрыцця універсітэцкай бібліятэкі. Газета «Звязда» паведамляла, што найбагацейшыя кніжныя калекцыі магнатаў Радзівілаў, Чапскіх будуць перавезены ў Мінск, ва універсітэцкую бібліятэку.

Аднак белапольская акупацыя Мінска спыніла мірную

(Заканчэнне на 2-й стар.).

[1] Рыгор Камінскі. «Зборнік успамінаў». Прыокское кніжнае выдавецтва. Тула. 1965.

ЯНЫ БЫЛІ ПЕРШЫ

СТВОРАНА АЛЯКСАНДРАМ ГРУБЭ

У ЗАЛЕ Дзяржаўнага мастацкага музея БССР, дзе сабраны творы беларускіх мастакоў 20-х — пачатку 30-х гадоў, увагу прыцягваюць вялізныя драўляныя скульптуры — «Тачачнік» і «Нявольнік». Іх аўтар — Аляксандр Грубэ.

«Тачачнік» і «Нявольнік» з'явіліся на ўсебеларускай выстаўцы 1929 года і зрабілі моцнае ўражанне на гледачоў. Скульптар раскрыў у «Тачачніку» веліч працы, надаў магутнай фігуры сімвалічнае гучанне. Сюжэт просты: рабочы штурхае гружаную тачку на гару. Ён ператвараецца ў суцэльны тугі вузел налітых магутнасцю мускулаў, кожны крок каштуе яму вялізнага напружання волі.

Каб ярчэй раскрыць змест, скульптар звяртаецца да трансфармацыі — перабольшвае формы, свядома пазбаўляе іх анатамічнай правільнасці. Ён падкрэслівае крутую лінію сагнутай спіны, упарта апушчаную галаву, пукатыя мускулы рук. Ступні здаюцца магутнымі карэннямі. А ўся фігура, як пісала ў свой час крытыка, уяўляецца «маналітным комплексам сіл, скіраваных на адну мэту ў пераможнай барацьбе жывой і мёртвай матэрыі».

Аляксандр Грубэ адносіцца да ліку тых майстроў беларускага савецкага мастацтва, якія стаялі ля яго вытокаў, якія, адразу прыняўшы і зразумеўшы рэвалюцыю, пачалі жыць адной думкай, адным дыханнем з народам, тварыць для яго, шукаць вобразы, сугучныя вялікаму рэвалюцыйнаму часу.

Захапляючыся мастацтвам з дзяцінства, А. Грубэ да спецыяльнай адукацыі не імкнуўся. Ён рыхтаваўся да кар'еры выкладчыка і даследчыка на фізіка-матэматычным факультэце Пецярбургскага універсітэта. Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны змянілі яго жыццёвыя планы. У 1918 годзе ён працуе настаўнікам на Магілёўшчыне. Тут і адрадзілася былое захапленне мастацтвам. Як бачым, да скульптуры звярнуўся ён параўнальна позна, ужо дарослым, і прафесіянальныя навыкі набываў самастойна. Але за кароткі час, дзякуючы таленту і настойлівасці, дасягнуў здзіўляючых вынікаў.

Ужо ў першых работах А. Грубэ адчуваўся размах. Яго заўсёды цягнула да вялікіх маштабаў. Яму здавалася, што гэтага патрабавала рэвалюцыйная эпоха. Не баючыся складаных задач, ён умеў выразна, у адпаведнасці са сваім разуменнем, вырашаць творчыя праблемы, выказваўся ў творах гранічна ясна, дастаткова поўна, не пакідаючы месца недагаворанасці. А. Грубэ нельга разглядаць па-за часам — ён увесь у ім. Ад часу залежалі многія поспехі і пралікі майстра. Час быў адчуты самабытным творцам, якому пашчасціла сказаць пра эпоху ўласнае слова.

Работу ў Мінску А. Грубэ пачаў у 1924 годзе з твораў рэалістычнага плана. Гэта былі статуя Ул. І. Леніна перад будынкам камвуза і партрэт Максіма Багдановіча. Статуя Леніна выканана нясмела. Партрэт жа Багдановіча даваў грунтоўную характарыстыку чалавека, нягледзячы на эскізнасць. Гэта адзін з першых на Беларусі скульптурных псіхалагічных партрэтаў, створаных на аснове дакументальнага матэрыялу. У ім добра выяўлена індывідуальнасць паэта і, разам з тым, перададзена абагуленае ўяўленне пра народнага песняра з лірычным складам таленту.

У ранні перыяд творчасці А. Грубэ выразаў з дрэва «Лірніка», дэкаратыўныя рэльефы на тэмы сацыялістычнага будаўніцтва, а таксама памянёныя статуі «Тачачнік» і «Нявольнік». Адным з першых у беларускай скульптуры А. Грубэ ўзнімаў важныя сучасныя тэмы, і ў гэтым яго несумненная заслуга.

Наколькі быў зацікаўлены А. Грубэ ва ўдасканаленні майстэрства і чулы да заўваг крытыкі, паказваюць яго помнік Ф. Дзяржынскаму ў Дзяржынску, помнікі Ул. І. Леніну для розных гарадоў БССР і, нарэшце, станковыя творы. Статуя Дзяржынскага ўяўляла сабой адзін з лепшых твораў аб палымяным рэвалюцыянеры ў беларускім мастацтве. Скульптура прыцягвае пластычнай цэласнасцю формы і на дзіва праўдзівай абмалёўкай характару і ўнутраных рысаў героя. Ад вобраза Дзяржынскага вее падкупляючай чысцінёй і прыгажосцю. На жаль, гэты твор, як і многія іншыя помнікі Грубэ, загінуў у час вайны.

У 1935 — 1940 гадах мастак працаваў над манументальна-дэкаратыўнай скульптурай для новых будынкаў Мінска, над праектамі помнікаў, станковай кампазіцыяй і партрэтамі. Шмат часу аддаваў ён ўдасканаленню прафесіянальных навыкаў. І характар яго работ паступова мяняўся. Яны станавіліся больш строгімі.

У беларускім мастацтве адбыліся істотныя змены. Папоўніліся рады моладзі, якая скончыла спецыяльныя мастацкія школы. Грубэ яшчэ ахвотней браўся за выкананне самых адказных заданняў. Пасля афармлення Дома ўрада група спецыялістаў удзельнічала ў рабоце па скульптурнаму ўбранню Мінскага Палаца піянераў. У ліку найбольш удалых твораў вылучаліся статуі «Авіямадэліст» і «Фанфарыстка», выкананыя А. Грубэ для аканмавання галоўнага ўваходу ў будынак.

Калі рэспубліка рыхтавалася да святкавання свайго дваццацігадовага юбілею і праводзіла дэкаду літаратуры і мастацтва ў Маскве, А. Грубэ прымаў у гэтых мерапрыемствах самы актыўны ўдзел. Ён падрыхтаваў дзве работы — кампазіцыі «Ленін» і «Беларус», шэраг іншых скульптур. «Беларус» цікавы тым, што працягвае лінію пошукаў скульптара над абагуленым вобразам - тыпам народнага героя. Калі раней у сваім «Лірніку» А. Грубэ трактаваў тэму ў лірыка-эпічным плане, дык цяпер ён акцэнтуе ў чалавеку валявы, дзейсны пачатак. Аўтар паказвае рослага селяніна з касою ў руках, рашучага, смелага.

Хочацца адзначыць яшчэ адзін бок дзейнасці А. Грубэ — яго грамадскую работу. Ён шмат гадоў знаходзіўся на пасадзе старшыні праўлення Саюза мастакоў БССР. За заслугі ў галіне развіцця беларускага выяўленчага мастацтва быў узнагароджаны ордэнам і ўдастоены звання заслужанага дзеяча мастацтва, а пазней — народнага мастака БССР. У час Вялікай Айчыннай вайны ён заставаўся на пасадзе старшыні праўлення Саюза мастакоў і праводзіў вялікую работу — збіраў, згуртоўваў сілы беларускіх мастакоў. І шмат працаваў — стварыў цудоўны партрэт Героя Савецкага Саюза Л. Даватара і рад іншых.

Сярод апошніх твораў А. Грубэ, якія экспанаваліся на ўсесаюзных выстаўках, можна адзначыць, у прыватнасці, яго праект помніка Ул. І. Леніну, для Масквы, зроблены ў конкурсным парадку і паказаны ў Манежы.

Для гісторыі беларускага савецкага мастацтва творчая спадчына А. Грубэ — прыклад творчай актыўнасці, грамадзянскай пазіцыі мастака, які заўсёды лічыў сваю працу прамым памочнікам справе партыі. Лепшыя творы скульптара, бясспрэчна, уваходзяць у залатую скарбніцу беларускага мастацтва. Яны яшчэ зробяць свой уплыў на рост не аднаго пакалення мастакоў.

І. ЕЛАТАМЦАВА.

ВЕЧНА МАЛАДОЕ

Хай стануць сучаснымі старыя рамёствы

НАГО не ўсхваляе непаўторная чароўнасць грузінскай чаканкі па металу, валагодскіх карункаў, палехскага роспісу! Нямала поспехаў і ў беларускіх прыкладнікоў. Шырока вядомы, напрыклад, віцебскія і пінскія драўляныя сувеніры, слуцкія тканыя рэчы, магілёўскія саламяныя лялькі, івянецкая кераміка.

Сёння выпуск мастацкіх вырабаў набывае індустрыяльны характар — на прадпрыемствах ставяць аўтаматычнае абсталяванне, запрашаюць кваліфікаваных майстроў, плануюць збыт.

У сувязі з бурным развіццём старога рамяства надзённай становіцца праблема утылітарнай каштоўнасці фабрычных мастацкіх вырабаў. Вядома, што частка прадукцыі нашых фабрык не карыстаецца (і трэба меркаваць, што ў цяперашнім выглядзе не будзе карыстацца) увагай пакупнікоў. На гэта ёсць свае прычыны. Паспрабуем разабрацца іх на прыкладзе асартыменту Мінскай фабрыкі мастацкіх вырабаў.

Асноўная прадукцыя фабрыкі — ільняное жаночае і дзіцячае адзенне. Яно зручнае, лёгка мыецца, добра кладзецца па фігуры. Льняная тканіна з лаўсанам мае новую важную якасць — яна мала камячыцца. Гэтыя вартасці і шырокая рэклама ствараюць на яго кан'юнктурны попыт.

Але фабрыка выпускае і іншую прадукцыю, напрыклад, мноства штучных кветак, якія распаўсюджваюць праз падарункавыя аддзелы магазінаў, паштучна і ў сувенірных каробках з іншымі вырабамі.

На фабрыцы разумеюць нізкую эстэтычную каштоўнасць кветкавай «прадукцыі», але гавораць, што без яе нельга: і «зверху» яе плануюць, і адыходы асноўных цэхаў трэба утылізаваць, ды і попыт вялікі, асабліва ў сельскай мясцовасці.

Магчыма, што некаторыя людзі і трымаюць на камодзе шоўка-паркалёвыя букеты, апырскваючы іх адэкалонам адпаведнага водару. Але хіба на такога спажыўца павінна арыентавацца фабрыка? Можна знайсці больш вартае выкарыстанне адыходаў раскройнага цэха. Тут ініцыятыва ў руках фабрычных мастакоў і тэхнолагаў.

На фабрыцы ў апошні час пачалі займацца пляценнем з лазы. Майстры, з якімі яна ўстанавіла кантакт, плятуць кошыкі, вазы і іншыя рэчы. Аднак гэтыя вырабы вельмі далёкія ад сучасных патрабаванняў: неахайныя, непрыгожыя, ім цяжка знайсці месца ў пакоі, прызначэнне іх часта наогул незразумелае. Варта прыгадаць, якія рэчы выраблялі нашы пляцельшчыкі да вайны. Тут былі і дзіцячыя ложкі, і крэслы-гушкалкі, і лаўкі, і дэкаратыўныя кошыкі для садавіны, і кошыкі для бялізны. Пры гэтым рэчы былі высокай якасці: зробленыя з тонкага прута, яны мелі мяккі сілуэт, складаны ўзор пляцення.

Сёння пляценне развіваецца ў многіх краінах. Апрача мэблі робяць падвесы, абажуры, рознага тыпу блюды, сумачкі дэкаратыўныя ўпрыгожанні і г. д. Трэба было б і Мінскай фабрыцы асвоіць гэтыя рэчы.

З рукадзельных работ фабрыкі цікавыя нацыянальныя паясы і ручнікі па ўзорах старажытных вышывак карункаў на разрэджаным палатне. Гэта вельмі тонкая і карпатлівая работа. Бо ажурныя філейкі ручнікоў вяжуць дзедаўскім спосабам, без пруткоў. Гэтыя рэчы унікальныя і цікавыя, але каштуюць дорага: самыя танныя — сорак рублёў. Па сутнасці яны выкарыстоўваюцца толькі як сувеніры для гасцей рэспублікі і для ўпрыгожвання фірменных магазінаў. У свой час ручнікі і паясы мелі дакладнае прызначэнне: паясамі падпяразваліся, а ручнікамі (набожнікамі) упрыгожвалі абразы ў куце. Сёння ж бяздумнае паўтарэнне старых узораў пакідае гэтыя рэчы без месца. Цяжка ўявіць сабе інтэр'ер, апрача музейнага, куды б яны гарманічна ўпісаліся.

Адраджэнне старажытнага рамяства — справа нялёгкая. Адным народным майстрам яго не асіліць. Тут павінны папрацаваць мастакі: пашукаць, выпрабаваць матэрыял, прапанаваць формы, якія спалучаюць беларускія традыцыі з сучасным стылем прыкладнога мастацтва. Павінны прыкласці сваю руку і архітэктары. Нядрэнна было б, калі б яны знайшлі нацыянальным дэкаратыўна-прыкладным вырабам месца ў сучасным масавым жылым інтэр'еры.

Арыенцірам у пошуках новых форм вышыўкі, пляцення, ткацтва можа стаць і грамадскі інтэр'ер, распрацаваны прымяняльна да прадметаў нацыянальнага мастацтва. Гэта надзённая задача мастакоў-дэкаратараў і архітэктараў. Сёння ў рэспубліцы падобнага, нават вопытнага, інтэр'ера няма.

Каб павысіць якасць дэкаратыўна-прыкладных рэчаў, трэба ўмацаваць матэрыяльную базу. Здаўна для пляцення выкарыстоўвалі, напрыклад, не толькі ачышчаны, але і не акораны лазовы прут, азёрны чарот, саломку азімага жыта або пшаніцы, лыка. Але гэтыя матэрыялы трэба хаваць у асобных памяшканнях, адбельваць у спецыяльных устаноўках з сярністай кіслатой. Гэта дасць багатую фактуру, магчымасць выкарыстаць лак і фарбы.

Напэўна, каб вырашыць пытанне пляцельнага рамяства, трэба стварыць спецыялізаваную фабрыку, якая працавала б не толькі на магазін, але і на прамысловыя прадпрыемствы, напрыклад, лікёра-гарэлачныя, кандытарскія, пастаўляючы ім сувенірную ўпакоўку для віна, цукерак, пячэння, тортаў і г. д.

У рэспубліцы няма ніводнага прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча, дзе рыхтавалі б кадры для мастацкай прамысловасці, асабліва па відах старажытных рамёстваў. Індывідуальнае вучнёўства цяпер, пасля доўгіх гадоў няўвагі да народнага промыслу, не можа даць кваліфікаваных майстроў.

Пытанні беларускага прыкладнога мастацтва не распрацоўваюцца тэарэтычна. Няма і якіх-небудзь вучэбна-практычных дапаможнікаў па гэтаму раздзелу.

Трэба аднавіць таксама мастацтва дэкаратыўнага металу, якое несправядліва ў нас забыта. Але і тут нельга абмяжоўвацца толькі падсвечнікамі. Трэба шукаць утылітарнае выкарыстанне каванага металу. Польскія майстры, напрыклад, куюць падстаўкі для кніжных паліц, робяць дэкаратыўныя петлі. У прынцыпе магчымы кованыя падвесы, люстры, вешалкі, ручкі да дзвярэй і шафаў, дэкаратыўныя накладкі і г. д. А якія велізарныя магчымасці адкрывае перад каваным металам наша вуліца! Наш вулічны інтэр'ер у апошні час запаўняецца многаметровымі вертыкальнымі і гарызантальнымі палосамі неонавай шыльды, часта без патрэбы. Навошта высвечваць неонавымі трубкамі «Гастраном», «Цырульня», «Кулінарыя» і г. д. — установы з пэўным колам наведвальнікаў? Па прыкладу вялікіх гарадоў неонавыя агні запальваюцца і ў раённых цэнтрах, дзе гэты від рэкламы не мае сэнсу.

Маюць рацыю прыбалтыйцы, калі карыстаюцца шыльдамі накшталт тых, што ў старажытнасць былі ў крамах цэхавых майстроў, — каванымі з металу. Яны прыемна вылучаюцца ў вулічным патоку, вызначаюць аблічча магазіна і ўпрыгожваюць вуліцу лепш, чым набор белых трубак і бляшаных літар.

Старажытныя рамёствы толькі пачынаюць адраджацца. Вывесці іх з межаў саматужных або адзіночных падзелак, вызначыць формы і прызначэнне, якія адпавядаюць патрабаванням сённяшняга дня, — важная і неабходная справа.

К. ТАРАСАЎ,
інжынер.

НАШЫ майстры МАСТАЦТВА

СЁННЯ ІГРАЕ УКСУСАЎ...

Пісаць пра Уксусава і лёгка і цяжка. Лёгка, бо за пятнаццаць гадоў яго работы ў тэатры імя Ленінскага камсамола Беларусі ўсе мы, брэстаўчане, паспелі пазнаёміцца з ім і добра ведаем яго як акцёра, якога даўно лічым «сваім» і без якога ніяк не ўяўляем трупы. Цяжка, бо артыст — гэта перш за ўсё яго ролі, тыя вобразы, у якія ён штовечар пераўвасабляецца. А іх — дзесяткі. Паспрабуй, выберы галоўныя, этапныя, калі кожны тоіць у сабе жывы, трапяткі «нерв», які звязвае адзін сцэнічны твор з другім у адзінае, непарыўнае цэлае, што, па сутнасці, складае індывідуальнае аблічча акцёра...

Бадай, не будзе перабольшаннем, сказаць: лёс Уксусава і брэсцкага тэатра — адзін лёс. Так здарылася, што некалькі гадоў назад акцёр пакінуў трупу, пераехаў у іншы горад. Пачалі ліхаманкава шукаць замену ў спектаклі, рабіць уводы. Але ранейшай «жывінкі» не ўдавалася дасягнуць. Не было той атмасферы імгненнай творчасці, якую кожны раз уносіў у спектакль Барыс Васільевіч. Не стваралася таго ўражання імправізацыйнасці, чым было адметна мастацтва менавіта гэтага акцёра. А праз год у тэатр прыйшло пісьмо: «Вяртаюся...» Пацягнула ў родны горад, да таварышаў па сцэне, дзе мінула столькі гадоў жыцця.

...Спектакль «Брэсцкая крэпасць» прынёс шырокую вядомасць тэатру імя ЛКСМБ, а разам з ім і маладому акцёру Барысу Уксусаву, які іграў аднаго з абаронцаў цытадэлі — знаходлівага вясёлага салдата Кукушкіна. Было ў Кукушкіне — Уксусаве нешта ад Цёркіна, ад многіх тысяч савецкіх байцоў, якія грудзьмі адстаялі ў вялікай вайне Радзіму. У гэтай ролі ўпершыню ў поўнай меры выявілася творчае «Я» Уксусава, яго манера ігры, яго, калі хочаце, сцэнічны почырк, які ад вобраза да вобраза станавіўся ўсё больш выразным.

Камедыйнае і драматычнае ў вобразе — гэтыя дзве лініі ў роўнай меры блізкія акцёру. У «Брэсцкай крэпасці» ён знітаваў іх у адзінае цэлае — у паўнакроўны чалавечы вобраз, разгадаўшы і дакладна распрацаваўшы сцэнічнымі сродкамі задуму драматурга К. Губарэвіча.

Праз два гады Барысу Васільевічу зноў давялося сустрэцца з роллю гераічнага плана, якая запатрабавала ад яго такой жа глыбіннай распрацоўкі, такой жа пільнай увагі да псіхалогіі чалавека. Гэта быў вобраз Аляксея Мярэсьева ў «Аповесці аб сапраўдным чалавеку». Акцёр адмовіўся ад прасталінейна-паказнога аптымізму, які яшчэ так шырока быў распаўсюджаны ў той час на сцэне і ў літаратуры. Ён не падкрэсліваў выключнасць подзвігу свайго героя. Мярэсьеў — Уксусаў і быў звычайным чалавекам у бальнічным халаце, як і яго сябры па шпітальнай палаце — камісар Вараб'ёў, стары салдат Сцяпан Іванавіч, што марыў даяваць «да кропкі», абгарэлы танкіст Лагуцін. Акцёр стварыў вобраз, у якім гераічнае аказвалася нечым такім жа абавязковым, як хлеб, вада, паветра. Ідэя пастаноўкі — гераічнае ў будзённым — вылучылася на першы план, дзякуючы ў першую чаргу ігры Барыса Васільевіча Уксусава.

Пошукі драматычнага не на паверхні ролі, а ў «нетрах» чалавечага характару працягваліся і ў час працы над вобразам прафесара Шонхаўзера ў спектаклі «Гарачае лета ў Берліне» — адной з самых значных работ тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі апошняга часу. Тут выканаўцу падпільноўвала небяспека меладраматызму, калі б ён зрабіў акцэнт на фізічных пакутах былога вязня фашысцкага канцлагера, чалавека змучанага і хворага. Акцёр катэгарычна адмовіўся ад такога падыходу. Стары праслаўлены музыкант Шонхаўзер на сцэне Брэсцкага тэатра быў па-юнацку ўзбуджаны, калі гаворка ішла пра музыку. Уксусаў маляваў яго барацьбітом, поўным душэўнай прыгажосці і высакароднасці. Гневам палалі яго вочы, калі гаварыў ён пра ганьбу, якою зноў спрабуюць пакрыць ягоную радзіму Германію былыя і новаяўленыя гітлераўцы. Верыш, што такі чалавек мог знайсці ў сабе сілы і мужнасць, каб не змаладушнічаць пад катаваннямі гестапаўцаў у гады вайны, а цяпер стаць у рады антыфашысцкай дэманстрацыі ў Заходнім Берліне.

І зусім іншы вобраз у спектаклі «Сокалы і вораны». Па глыбіні пранікнення ў псіхалогію Штапнова — гэтай нікчэмнасці, чалавечага зломка, акцёрская работа Барыса Васільевіча Уксусава, бясспрэчна, варта спецыяльнага тэатразнаўчага аналізу. Артыст глыбока раскрыў подлую сквапнасць свайго персанажа.

А назаўтра ідзе спектакль «Звычайны чалавек». І зноў на падмостках Уксусаў. Здзіўляешся лёгкасці, арганічнасці, з якой акцёр жыве ў віры забаўна-камедыйнага дзеяння п'есы Браніслава Нушыча. Пасля складанейшых эмацыянальна-лагічных нюансаў у паводзінах героя сумбатаўскай п'есы — Феерверк весялосці, дасціпных знаходак у ролі старога халасцяка Вічэнціе Пётравіча з тыповай камедыі становішчаў. З якой іскрамётнасцю праводзіць Уксусаў эпізод ігры Вічэнціе з Арсай у шахматы. Якое тут багацце інтанацый! Глядзельная зала літаральна ўзрываецца смехам і воплескамі, як толькі на сцэне з'яўляецца худая постаць Вічэнціе з нязменным стракатым парасонікам у руках.

Сам акцёр прызнаецца, што іграць у камедыі для яго — асалода, хаця справа гэта зусім нялёгкая. «Камедыя патрабуе выключнай пластычнай і моўнай выразнасці, — гаворыць Барыс Васільевіч. — Я зразумеў гэтую ісціну пасля ролі Фігара. А што датычыцца ігры ў псіхалагічнай драме, дык, напэўна, меў рацыю швейцарац Дзюрэнмат: да трагедыйных вышынь можна дайсці толькі праз камедыю. Бо і ў жыцці не заўсёды адрозніш, дзе канчаецца весялосць і пачынаецца смутак. Хіба «зробіш», напрыклад, Расплюева ці Башмачкіна, не маючы пачуцця камедыйнасці?...»

Выканаўчую манеру Уксусава цяжка ацаніць з пункту гледжання так званага «сучаснага» стылю ў прымітыўным яго разуменні. Героі артыста — гэта людзі з адкрытымі характарамі, яркімі пачуццямі. Уксусаў не баіцца рэзкага жэсту, нязвыклай галасавой мадуляцыі, раптоўнага пераходу ад шэпту да крыку. Усё гэта ніколі не здасца фальшывым, калі апраўдана ўнутрана, падрыхтавана логікай развіцця вобраза. Так некалі іграў ён Кукушкіна, так пазней іграў Сяргея ў «Іркуцкай гісторыі» і Марта Туйска ў «Блудным сыне», так іграе сваю новую ролю — пісьменніка Касагорава ў спектаклі «Уцёкі з начы». І ўдзячныя апладысменты — пацвярджэнне «сучаснасці» акцёрскага стылю Уксусава.

Сучаснасць мастацтва акцёра — у разуменні індывідуальнасці аўтара, ва ўменні мысліць на сцэне, быць розным і ў той жа час заставацца самім сабою. Дарэчы, Уксусаў амаль ніколі не звяртаецца да грыму, спецыяльных наклеек. Вонкавая характэрнасць — не яго стыхія. Грым «абцяжарыў» бы яго, «затармазіў» уласцівую яму экспрэсіўнасць. Паношаны, але акуратна адпрасаваны касцюм, сівы парык — вось і ўсё, чым карыстаецца Барыс Васільевіч, выходзячы на падмосткі ў ролі прафесара Шонхаўзера («Гарачае лета ў Берліне»). А стары, «някрасаўскі» шалік — красамоўная дэталь вонкавага аблічча сумуючага па радзіме пісьменніка Касагорава ва «Уцёках з начы».

...Вось ужо больш за пятнаццаць гадоў не сыходзіць з афіш тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі імя заслужанага артыста рэспублікі Барыса Васільевіча Уксусава. Вырасла новае пакаленне гледачоў. Але і для яго акцёр Уксусаў застаўся «ўладаром дум». І часта чуеш, як, ідучы на спектакль, у якім заняты любімы акцёр, гледачы з павагай і гордасцю гавораць: «Сёння іграе Уксусаў!».

Мікалай РЫБАКОЎ.

Б. Уксусаў у ролі Касагорава.

Літаратура! Мастацтва

ЧАРГОВЫЯ СЮРПРЫЗЫ

ТРОХІ больш года назад «Літаратура і мастацтва» пісала, што кінарэклама ў Мінску часта здзіўляе непісьменнасцю. Амаль ад кожнага рэкламнага шчыта можна чакаць сюрпрызу — або арфаграфічных памылак у назве фільма, або сэнсавай недакладнасці.

Карэспандэнт газеты паспрабаваў тады высветліць прычыну гэтай аршыннай непісьменнасці. Ён гутарыў з дырэктарамі некаторых кінатэатраў, кіраўнікамі гарадской канторы кінапракату, гарадскога ўпраўлення кінафікацыі.

Як гэта часам бывае, кожны з іх спрабаваў спіхнуць віну на іншага. Той не ведае беларускай мовы, той у гэты час быў заняты іншымі справамі і г. д.

Нарэшце, кіраўнік гарадскога ўпраўлення кінафікацыі Н. В. Яблыкава выказала думку, што ў горадзе трэба стварыць адзіны цэнтр па перакладу назваў фільмаў на беларускую мову і ўкамплектаваць яго кваліфікаванымі перакладчыкамі.

Мы так і не ведаем, ці ўдалося стварыць перакладчыцкі «цэнтр». Ведаем толькі, што кінарэклама ў Мінску па-ранейшаму можа выкінуць раптам каленца непісьменнасці. Наш карэспандэнт толькі што сфатаграфаваў адну з рэклам, устаноўленых ля кінатэатра «Мір». «Лёс Золтана Карпаті» — напісана на ёй. На якой гэта мове? На беларускай? Але ж нават вучань пачатковых класаў ведае, што ў беларускай мове перад мяккай галоснай «т» пераходзіць у «ц».

Перада мной пісьмо нашага чытача А. Страпчага. «Нехта аднойчы сказаў, — піша ён, — што незнаёмай мове лепш за ўсё вучыцца па шыльдах і афішах. Дзе-дзе, а ў Мінску гэтай парадзе следаваць нельга, бо афішы, асабліва кінаафішы, тут стракацяць памылкамі. «Уцякач» — паведамляе пра выхад новага фільма адна рэклама, «Убягач» — другая. А ў кінатэатры «Піянер» фільм «Маленький беглец» пераклалі на «Маленькі ўбягач». «Шанцуе» і назвам з імёнамі ўласнымі — «Крысціна» і «Хрысціна», «Лапецяус», «Лапетеус» і «Лапетэус». А вось як паведамляюць пра двухсерыйныя фільмы: «У дзвюх серыях», у дзвух», «дзвох» і нават «дзвёх».

Сорамна, проста сорамна за людзей, якія так безадказна ставяцца да прапаганды кіно».

А вось яшчэ пісьмо: «...Калі вы не ведаеце, куды дзяваць свой адпачынак, дык вы яго — у мора... Іменна да гэтага заклікае рэклама кінатэатра «Перамога». Фільм «Отпуск у моря» тут пераклалі, як «Адпачынак у мора». Няўцям мясцовым грамацеям, што рускі прыназоўнік «у» па-беларуску — «ля» ці «каля»...

Такія прыклады можна прыводзіць бясконца. Ну і што далей? Зноў знайсці вінаватага не так проста. Пазванілі дырэктару кінатэатра «Мір» В. П. Гарбовіч.

— Мы не пры чым, вінавата кантора кінапраната, якая павінна перакладаць назвы кінафільмаў.

Звязваемся з канторай. Ля тэлефона намеснік кіраўніка В. А. Перавознікаў:

— Перакладаць павінны людзі з Камітэта па кінематаграфіі...

Званок у гарадское ўпраўленне кінафікацыі. Адказвае інспектар па рэпертуару Ул. А. Басько. Гэты ведае, як гаварыць з рэдакцыяй. Выслухаўшы, адразу парайкінаўску адказвае: «Будзьзроблена».

— Што зроблена?

— Ём, выклічам і пакараем...

Адным словам, казка пра белага бычка... Ці не час ужо Камітэту па кінематаграфіі сур'ёзна ўмяшацца ў гэтую справу? Трэба ж, нарэшце, зразумець, што непісьменная рэклама — абраза кожнаму мінчаніну і кожнаму госцю нашай сталіцы.

СТАРОНКІ НЕНАПІСАНАЙ ГІСТОРЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

працу народа. Пасля вызвалення Мінска Савет Народных Камісараў, Цэнтральнае Бюро Кампартыі Беларусі ў канцы 1920 года прымаюць захады, каб адкрыць універсітэт з лабараторыямі, клінікамі і бібліятэкай. Гэтай справай непасрэдна займаліся старшыня ЦВК і Саўнаркома А. Р. Чарвякоў, старшыня Цэнтральнага Бюро Кампартыі Беларусі В. Г. Кнорын, народны камісар ваенных спраў Я. А. Адамовіч. Было вырашана перавезці з Петраграда бібліятэку прафесара Жуковіча і набыць бібліятэку прафесара Пятроўскага ў Казані.

Неўзабаве была склікана нарада прадстаўнікоў усіх ведамстваў з удзелам В. Г. Кнорына, прафесуры універсітэта і загадчыка бібліятэкі. Бібліятэчнай секцыі было прапанавана прыступіць да разбору кніг, гаспадарча-будаўнічай — тэрмінова пачаць абсталяванне бібліятэкі.

Такім чынам, ёсць падставы лічыць дату нараджэння універсітэта — кастрычнік 1921 года (а не 1922 год, як пішуць некаторыя нашы даследчыкі) — датай нараджэння універсітэцкай бібліятэкі, якая з 1922 года стала Дзяржаўнай. Асобны будынак для бібліятэкі быў узведзены на Чырвонаармейскай вуліцы. Наваселле бібліятэкі стала важнай падзеяй у культурным жыцці не толькі Мінска, а і рэспублікі.

Адначасова інтэнсіўна развівалася сетка прафсаюзных культасветустаноў. У 1925 годзе ў Мінску ўжо было 23 клубы розных прафсаюзаў з бібліятэкамі і чытальнямі. Цікавая работа праводзілася ў бібліятэцы-чытальні клуба Цэнтральнага Савета прафсаюзаў імя Прафінтэрна (Дом працы).

У 30-х гадах пачалося будаўніцтва самастойных клубных будынкаў са спецыяльнымі памяшканнямі для бібліятэк і чытальняў. Так, на тэрыторыі цяперашняга стадыёна «Дынама» быў пабудаваны клуб металістаў; на рагу Інтэрнацыянальнай і Камсамольскай вуліц — клуб харчавікоў; клуб савецкіх служачых на вуліцы Энгельса. Добра былі ўкамплектаваны бібліятэкі завода імя Мяснікова, фабрыкі «Камунарка» і іншых прадпрыемстваў.

У Мінску ў канцы 1926 года былі дзве акадэмічныя бібліятэкі (універсітэцкая з фондам у 250000 тамоў і Інстытута беларускай культуры), пяць палітасветаўскіх, сетка перасоўных пунктаў і хат-чытальняў на ўскраінах горада.

У цэнтральнай бібліятэцы імя Пушкіна налічвалася да 35 тысяч кніг. За пяць гадоў (з 1922 па 1926 гг.) фонд яе вырас удвая. За тэты час яна атрымала столькі ж кніг, як за папярэднія 20 гадоў. Больш чытачоў было ў бібліятэцы імя Пушкіна, галоўным чынам у аддзеле белетрыстыкі. Сярод чытачоў найбольшы працэнт складалі вучні і дзеці. Для іх наладжваліся гутаркі, чытанні, арганізоўваліся розныя гурткі. Для папулярызацыі кніг сярод рабочых бібліятэка імя Пушкіна арганізоўвала перасоўкі на прадпрыемствах. Іх было ў той час 70. Надзвычай вырас попыт на беларускую літаратуру. Кнігі на беларускай мове былі самымі ходкімі.

Адбываўся імклівы рост бібліятэк у Мінску, развівалася і паглыблялася іх работа, павышаўся культурны ўзровень чытачоў. Гэтаму росту ў многім памагла пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР «Аб бібліятэчнай справе ў Саюзе ССР» (1934 г.).

У гэтым жа годзе быў праведзены Усесаюзны бібліятэчны перапіс па стану на 1-е кастрычніка. Паводле дадзеных гэтага перапісу, у Мінску налічвалася 214 бібліятэк з фондам у у 3235 тысяч кніг. У бібліятэках працавала больш 320 штатных работнікаў.

У канцы 1940 года Мінскі гарадскі Камітэт партыі стварыў камісію, якой даручалася падрыхтаваць канкрэтныя прапановы, каб палепшыць работу бібліятэк у горадзе. Камісія сабрала цікавыя матэрыялы. Гарком партыі адзначаў, што ў Мінску значна вырасла колькасць масавых бібліятэк, павялічыўся іх кніжны фонд, пашырылася кола чытачоў. Фонд бібліятэк беларускай сталіцы, уключаючы 1900 тысяч кніг Дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна, дасягнуў, паводле няпоўных дадзеных, 3700 тысяч кніг.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны Мінск меў шырокую сетку бібліятэк. На аднаго жыхара ў сярэднім прыпадала 13—14 кніг.

Незлічоныя страты нанеслі народнай гаспадарцы і культуры гітлераўскія захопнікі. Моцна пацярпелі нашы бібліятэкі. Іх кніжныя фонды фашысцкія варвары знішчылі. І як заўсёды бывае ў нас — на дапамогу беларускаму народу прыйшлі братнія народы савецкіх рэспублік. Уся краіна памагала нам. Бібліятэкі Масквы, Казані, Сібіры, Мардовіі пасылалі нам дублетныя экземпляры кніг.

Мы добра памятаем наш разбураны вайною Мінск. Нялёгка было ў гэты час займацца аднаўленнем сеткі бібліятэк, калі на парадку дня стаялі тысячы іншых пытанняў. І ўсё ж 11 мая 1945 года бюро Мінскага гаркома партыі абмяркоўвала гэтае пытанне. У рашэнні гаварылася, што адноўлена толькі адна бібліятэка імя Пушкіна, а на вялікіх прадпрыемствах няма чытальняў. Былі прыняты меры

ВЫХОДЗЯЦЬ НА ЭКРАНЫ

«МСЦІСЛАЎ РАСТРАПОВІЧ»

Усяму свету вядома імя выдатнага савецкага віяланчэліста, лаўрэата Ленінскай прэміі Мсціслава Растраповіча. Многія кампазітары — Сяргей Прокоф'еў, Бенджаін Брытэн, Анры Соге — прысвяцілі яму свае творы. Растраповіч, аднак, не толькі выканаўца, але і педагог. Ён выхаваў у Маскоўскай кансерваторыі цэлую плеяду музыкантаў.

Пра Растраповіча — славутага выканаўцу і педагога — гэты фільм.

Вытворчасць Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў.

«ГАТЧЫНСКІ ПАРК»

Гатчына — былы маёнтак графа Рыгора Арлова, падораны яму Кацярынаю II. Тут, у маляўнічым прыгарадзе Пецярбурга, у 1766 годзе па чарцяжах архітэктара Рынальдзі быў закладзены цудоўны палац, вакол якога прыгонныя сяляне пасадзілі парк. Садоўнікі захавалі ў ім натуральную прыгажосць нашай паўночнай прыроды.

Мастацкія багацці Гатчыны ствараліся працаю многіх пакаленняў. Восемдзесят залаў — адна прыгажэйшая за другую — сталі помнікам натхнёнай працы народных майстроў.

Вытворчасць Ленінградскай кінастудыі навукова-папулярных фільмаў.

«НА ПАРОЗЕ ДРУГОГА СТАГОДДЗЯ»

Маскоўская дзяржаўная кансерваторыя адсвяткавала сваё стагоддзе. Многія яе выпускнікі заслужылі сусветную славу, атрымалі перамогі на міжнародных конкурсах.

У фільм уключаны здымкі юбілейных урачыстасцей, канцэрты студэнтаў і прафесараў, адкрытыя ўрокі вядучых педагогаў, а таксама кінаэтапісны матэрыял, які расказвае аб гісторыі праслаўленай музычнай вну краіны.

Вытворчасць Цэнтральнай студыі дакумент

РАДАСЦЬ ЗЯМЛІ

Гаворачы пра кнігу Сяргея Панізніка «Кастры Купалля», перш-наперш хочацца адзначыць шчырасць маладога паэта, любоў да роднага краю (прада, могуць сказаць, што без гэага ўвогуле немагчымы паэт), торчы энтузіязм, які ўласцвы, зноў-такі, бадай усёй нашай маладой паэзіі.

Цэнтральная тэма зборніка — тэма радзімы, бацькаўшчыны. Праўда, родная Беларусь бачыцца паэту, асабліва ў вершах, што змешчаны на першых старонках кнігі, у стракатых, нават часам «экзатычных» фрбах, як «краіна сінечы» з падыцыйнай «папараць-кветка», з «кастрамі Купалля» і г. д.

Нагадаем, аднак, што С. Панізнік жыў і вучыўся ў Львове, вершы паэта часта друкаваліся на Украіне, і таму ён мае, пэўна, права на такі ракурс у размове з чытачамі пра Беларусь, на рамантычны расказ «гід» пра малазнаёмы людзям край. Разумеючы гэта, даруеш і этнаграфію, і даволі банальныя «лінія зоры», «срэбраны вета», «шэрых гусей», якія трапляюцца ў гэтым усхваляваным «расказе».

Аднак, калі б кніга складалася толькі з такіх — знешні, агульных карцін, замалёвак, дэталей, то мы не маглі б ганарыцца пра яе як пра набытак сучаснай маладой паэзіі. Не, у кнізе С. Панізніка добра відаць разуменне задач і абавязкаў сучаснай паэзіі, якая жыве праным пазнаннем чалавечага свету, дорачы людзям адкрыцці, фарміруючы іх духоўны свет.

Дзякуючы актыўнасці паэтычнага мыслення, С. Панізніку ўдаецца надаць многім сваім вершам актуальную праблемнасць. Таму чытаючы нават такія радкі, звернутыя да роднай Беларусі, —

Што ёсць, скажы,
ў тваіх лугах і пушчах,
чаго спрадвек шукалі песняры
і пранасілі па мастах
рыпучых,
калі ў Купалле ладзілі
кастры?—

я бачыў у гэтым, на першы погляд, крыху наіўным і рытарычным запытанні праявы дзейснага паэтычнага перажывання, натуральнага для чалавека, які хоча пазнаць сутнасць з'явы.

С. Панізнік — малады паэт. А творчая сталасць, вядома, прыходзіць не адразу — творчая асоба, яе светапогляд, якім вызначаецца паэтычная свядомасць і актыўнасць, фарміруюцца паступова. І тое, што гэты працэс у С. Панізніка ідзе нармальна, усвядомлена, дазваляе нам верыць у яго плённую будучыню.

Мяне адкрывалі моры,
мяне адкрывалі горы,
і гора —
цяжкай навалай —
таксама мяне адкрывала.
І я,
напалову зведаны,
праходзіў маўклівым сведкам.
Я добра не вызнаў шлях,
яшчэ не абраў
каляіны,
бо ведаў — яшчэ зямля
сына
адкрыць павінна.
Каб з новай патрэбай жыць
і шчыраму сэрцу парадзіць
самога сябе адкрыць
веку,
Радзіме,
праўдзе.

У гэтых радках С. Панізніка бачацца мне важныя рысы партрэта майго маладога сучасніка, які настойліва і сумленна шукае сябе, сваё месца сярод людзей. Паказальна, што ў сваіх пошуках ён зноў звяртаецца да Радзімы. Яна — крытэрый яго маральнасці і грамадскай каштоўнасці.

Чым далей чытаеш кнігу С. Панізніка, тым больш і больш адчуваеш душэўны ўздым паэта, больш трывалымі і дзейснымі становяцца словы, расце іх экспрэсія, павялічваецца псіхалагічная і сэнсавая нагрузка. Мне бачыцца тут кампазіцыйны прынцып кнігі: ад «агульнага» («праграмнага») — да канкрэтнага, аналітычнага.

Да паэта прыходзіць сапраўдная раскаванасць думкі, шырыня погляду, глыбіня асэнсаванняў. Цудоўна гучыць «Давайце развядзем сасновы бор» — адзін з лепшых вершаў зборніка. Вельмі цікавы і верш «А прырэчча шалела ліўнямі» — з паўнакроўным, арганічным адчуваннем прыроды, яе ўнутранага жыцця, зразумелага толькі сапраўднай паэзіі.

А прырэчча шалела ліўнямі,
захлыналіся берагі.
Нават яблыні сарамлівыя
з саду кінуліся ў лугі.

Завязалі на памяць завязь,
і дасвецем з-за ціхіх хат
наваколлю ўсяму на
зайздрасць
зноў вярталіся ў родны сад.

Жнівень першы кісліцы
зведаў,
ім падставіў сваё плячо.
Гойдаў вецер
у вечар светлы
зелянчо...

Сад калыша
зямля азяблая,
нецярпліва сукі трасе,
Ноч...
Чаканне...
Крамяны яблык
Перакульваецца ў расе...

Тэма прыроды ў вершах С. Панізніка, як усякая іншая тэма, да якой звяртаецца паэт, неад'емная ад самага галоўнага ў ягоным паэтычным свеце — ад думак пра Радзіму. Патрыятычным пачуццём пранізаны ўсе яго лірычныя пейзажы — «За Лахвою белыя чаромхі», «Плылі хлапцы...», «Па-за ціхай грамадой лясоў», «Звон расы, і ветах, і дарога», «Вечар смачна пахне сырадоем» і многія іншыя. І гэта невыпадкова, бо пачуццё патрыятызму пастаянна ёсць у яго перажываннях, у значнай ступені вызначаючы, як мне здаецца, своеасаблівасць творчай індывідуальнасці паэта.

Варта адзначыць, што, выяўляючы свае пачуцці ў пафаснай форме, С. Панізнік імкнецца і да глыбокага асэнсавання сваіх перажыванняў. І ён умее думаць, аналізаваць, заглыбляцца ў праблему, усведамляючы сваю адказнасць за трывогі і клопаты сучасніка.

У цішыні
вялікі змест ляжыць,
патрэбны мне і непрыгодны,
І я пытаюся ў зямлі
грымотнай:
— З якою цішынёю
будзем жыць?..

Змястоўныя і цікавыя вершы С. Панізніка пра каханне «Я ўжо буду люшку закладаць...», «Настояла галінкі цішыня...», «Назаву я цябе беларускаю...», «Ты чаму у мяне няветлая?..» Яны адкрываюць нам новыя бакі душэўнага жыцця паэта, дапаўняюць наша ўяўленне аб ім.

У кнізе ёсць і вершы, дзе паэт прама гаворыць «пра сябе» («Акрамя аўтаручкі ў мяне аўтамат») — пра нелёгкія ваенна-курсанцкія будні. Хочацца, каб гэтакіх вершаў «пра сябе» было ў паэта больш, бо ці трэба даводзіць, як гэта важна для лірыка. Мне даўно спадабаўся ў С. Панізніка верш «Паўзлі мы шурпатым снегам...», дзе гаворыцца пра цяжкую працу савецкага салдата, патрэбную, каб на зямлі панаваў мір. У другім месцы паэт гаворыць «На шалях маіх далоняў — радасць зямлі». Так зноў — з уласнага, біяграфічнага вынікае думка пра чалавечую адказнасць за лёс зямлі, толькі ўжо без той агульшчыны, за якую мы на пачатку кнігі часткова напавер прызнавалі істотнымі рысамі творчага аблічча паэта яго патрыятызм і грамадзянскасць, творчы энтузіязм.

Ул. ГНІЛАМЁДАЎ.

С. Панізнік. «Кастры Купалля». Выдавецтва «Беларус», Мінск, 1967.



Больш за дзесяць год Наталля Сцяпанаўна Маісеенка загадвае чытальнай залай Заслаўскай гарпасялковай бібліятэкі Мінскага раёна. Наталля Сцяпанаўна цікавіцца густамі чытачоў, часта праводзіць гутаркі па прачытаных кнігах. Гэты здымак зроблены ў чытальнай зале, калі да Маісеенкі прыйшлі чытачы Люда Грыгалінус, Валя Бяляўская і Галя Жукоўская.

Фота Ул. КАШКАНА.

БЫЦЬ САМІМ САБОЙ

Вось цалкам верш:

Уранку сонца, нібы мак, цвіла,
І усё вакол жыло і харашэла.
Мы думалі: пагода і ціпло
Нарэшце будзе, можа, тыдзень
цэлі.
Ды раптам хмары вецер
пазбіра,
І дождж лінуў струменямі
тугін.
...Так ад людзей чакаем
мы дабра,
Яны ж парой бываюць
благім.

Гэта не пародыя. Алесь Ставер уключыў працытаваны верш у раздзел лірыкі сваёй новай кнігі «Ластаўкі перад дажджом». Які «пранікнёны» лірызм, якая «цяжкапасціжыма» глыбіня думкі! Асабліва ўражвае канцоўка — «філасофскі» вывад, да якога мы ні за што б, відома, не дадумаліся...

Але жартаваць не хочацца. Сумна. Сумна таму, што вельмі многія вершы ў зборніку падобныя на гэты.

Прачытаўшы зборнік, я знайшоў у ім пяць добрых вершаў. Адзін з іх нават запомніў напамяць. І калі б не гэтыя пяць вершаў, не было б сэнсу пісаць рэцэнзію. Больш да месца была б кароткая рэпліка ў адрас аўтара і выдавецтва, якія так недарэчы пажартавалі з чытача.

Але ж добрыя вершы ў зборніку ёсць, і пра паэта трэба міркаваць перш за ўсё па таму добраму, што ён стварыў. Вельмі хочацца таксама па-сяброўску памагчы аўтару разабрацца ў яго паэтычнай гаспадарцы. Таму пачну з сапраўдных вершаў кнігі «Ластаўкі перад дажджом».

Вось васёлы аўтакартэж язджае ў пасёлак. За рулём адой з машын — жаніх, шафёр. Ля дома нявесты вядуць размову скрыпка і бубен. Паслухаем дыялог:

Скрыпка гучна стала весці:
— Будзем піць і будзем есці!
Будзем піць і будзем есці!

Адчуваеце, які тоненькі радасны галасок у скрыпкі. І якая ўпэўненасць у тым, што сватаўство пройдзе як нельга лепш. Але ў размову ўступае «разважлівы» бубен — бас яго пакуль яшчэ гучыць дабрадушна, але ён ужо здольны трошкі ахаладзіць заўчаснае захапленне скрыпкі:

Бубен біў у добрым гудзе:
— Будзем бачыць, што там
будзе!
Будзем бачыць, што там будзе!

І вось аказваецца, што нявесты няма дома, «яна з'ехала да цёткі ў горад». Госці ўжо бяруцца за шапкі. І зноў галасы скрыпкі і бубна:

— Не пілі мы і не елі!
Не пілі мы і не елі!
Бубен біў у сумным гудзе:
— Я так ведаў, што так будзе!

Потым госці дазнаюцца, што дзяўчына не хоча выходзіць замуж за хлопца. Даводзіцца ім паварочваць назад. І вось як рэагуюць на гэта скрыпка і бубен:

Скрыпка горка галасіла:
— Шчасце дзеўчына
ўпусціла...
Шчасце дзеўчына ўпусціла...
Бубен біў у злосным гудзе:
— Там, дзе ты, — дык гэтак
будзе!
Там, дзе ты, — дык гэтак
будзе!

Ці не праўда, уражанне такое, быццам перад намі таленавіта разыгралі маленькую дасціпную п'еску, якая хоць і не прэтэндуе на вялікую глыбіню, але затое цудоўна арганізаваная, наскрозь прасякнутая немудрагелістым, добрым гумарам?

Дазвольце, — скажуць некаторыя чытачы, — а ў якім, уласна, веку ўсё гэта адбываецца? І ці не занадта прымітыўныя пачуцці і настрой «скрыпкі» і «бубна» для нашага часу, калі чалавечы мозг вырашае складаныя філасофскія і тэхнічныя праблемы?

Але і ў наш век вучоны, пакінуўшы кабінет або лабараторыю, ідзе ў лес — слухаць «прымітыўных» салаўёў, нюхаць «традыцыйны» бэз. Я бачыў вельмі сур'ёзных людзей, якія ад душы смяяліся, слухаючы з эстрады верш «Скрыпка і бубен». Ды што там казаць, верш напісаны па-майстэрску. І не будзем патрабаваць ад паэта таго, чаго ён даць не можа, што не характэрна для яго.

Яшчэ адзін верш — «Песня адной імянінніцы»:

Як жывуць, падружанькі, —
Не пытайце мяне.
Хай такі лёс, падружанькі,
Вашых дочак міне.
З мужыкамі вы ды і з дзеткамі,
А я ўсё адна.
Піце, госці, гарэліцу, —
Наставую віна.

Сказана быццам нямнога; а мы жыва ўяўляем сабе немаладую сялянку з яе няўдачлівым лёсам, чуем яе перарывісты ад хвалявання голас. Паэт знайшоў адзіна прыймальны, як мне здаецца, спосаб выражэння. Больш ускладненыя прыёмы аказаліся б тут не да месца.

Не буду разбіраць іншыя вершы, якія спадабаліся мне. Іх нямнога. Да двух працытаваных дадам яшчэ «Нікагусенькі няма», «Запавет», «Трасуху»... Вось, здаецца, і ўсё. У іх паэт Алесь Ставер, як кажуць, знайшоў сябе, знайшоў у чыстых і глыбокіх крыніцах вуснай народнай творчасці, у сувязі з казкамі, паданнямі, прымаўкамі.

Але А. Ставер сам разумее, што яго паэтычны дыяпазон вузкаваты, і імкнецца вырвацца на грэбень сучаснага жыцця. А на грэбнях хваль можа ўтрымацца толькі вопытны, моцны плывец.

Гавораць, што калі ў пісьменніка ёсць думка, дык яна сама знойдзе лепшы спосаб для свайго выказвання. Бяда, калі думкі няма. Тады нават у чалавека, які, здаецца, і валодае пяром, атрымліваецца вось гэтакае:

Пляваць на стому! Я сваё
Прайду, да круцізны
прывычны.
Бо і ў жыцці — штодзень
пад'ём,
Штодзень — як подзвіг
гераічны.

Куды падзелася ўменне Ставера ладкаваць вершы трывала, дасціпна? Паэзія знікла, не пакінуўшы нават следу.

Дазволю сабе яшчэ цытату, на гэты раз — апошнюю.

У вершы, прысвечаным Андрэю Вазнясенскаму, Ставер без ценю ўсмешкі піша:

Пройдзем мы па галовах гор,
І на гары вышэйшай станем, —
Там толькі неба і прастор,
І змей ніякі не дастане.

Адносна Вазнясенскага — не ведаю, магчыма, альпінізм яму і не супрацьпаказаны, а вось Ставеру ні ў якім выпадку не трэба ўзбірацца на гару, няхай нават і падразумяваецца, што гэта гара — Алімп. Паэтычныя скарбы чакаюць яго ўнізе, на зямлі, сярод беларускіх вёсак, ніў і лясоў.

Паэтычная будучыня Алеся Ставера знаходзіцца ў руках яго самога. Ён можа выпеставаць свой талент і ўзняць яго, а можа і пахаваць у мностве бяздумных, невыразных вершыкаў, вытворчасць якіх не зрабіла б гонару нават дрэнна наладжанай праграміраванай машыне.

Уладзімір ВАРНО.

Алесь Ставер. «Ластаўкі перад дажджом». Выдавецтва «Беларусь», Мінск, 1967.

Паэтычная паверка

Хаім МАЛЬЦІНСКІ

■ ■ ■

Вагонамі дні
Прабягаюць таропка,
А я ўсё справую
Пацэліць у кропку.
То нізка бяру,
То занадта высока.
Мішэнь прадзіравіў
Ля кропкі навокал.
З гадамі
І зрэнкі мае знемагаюць.
Я цэлюся зноў —
І павекі мігаюць.
Страла мая зноўку
Праносіцца міма.
А кропка трымціць
І трымціць прад вачыма.
І ўжо расплываецца,
Быццам загадка,
Язык мне паказвае,
Як чарцянятка.

Пераклад з ідышскай мовы П. МАКАЛЯ.

■ ■ ■

Адзіная трывога —
На ногі ўзняць малога.

І смех,
І грэх,
І гора —
Тут клопатаў па горла.

Бабуля прыгадала:
Сама як гадавала —
Спакойна ды напеўна.
А тут усё — няпэўна.

Спакой застыў на валаску...
Пякуцца бабкі на пяску.

Пераклад Д. БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВАЙ.

НОВЫ АЧАГ

Яшчэ бярвенне
аддае смалой.
Але тут бору пах
недаўгавечан,
бо стол ужо накрыт,
і з чапялой
яна —
нібы жароўня —
каля печы.

Пераклад Я. СЕМЯЖОНА.

■ ■ ■

О, са сваёй старэнькаю кашчавай,
Якая вісне толькі нада мной,
Не хочацца мне нават і спрачацца:
Чарга прыйшла сабрацца на спакой,
Пара прыйшла са светам развітацца.

І як бы я смяртэльнай хваткай сцяў
Смерць тую,
Што зразае парасткі жыцця!

Пераклад Ю. СВІРКІ.

ЗАБЫТЫЯ ІМЁНЫ

БЕЛАРУСКІ ФІЛОСАФ І МЫСЛІЦЕЛЬ

Імя беларускага філосафа і мысліцеля пачатку XIX ст. А. Доўгірда амаль нічога не гаворыць сучаснаму чытачу. А між тым гэта быў чалавек высокай адукацыі, які падняўся на ўзровень вышэйшых дасягненняў філасофскай навукі свайго часу.

Аніёл Андрэевіч Доўгірд нарадзіўся на Магілёўшчыне ў маёнтку Юркаўшчына Мсціслаўскага павета ў 1776 годзе. Бацька яго быў небагатым памешчыкам. Вучыўся будучы філосаф у Мсціслаўлі і Магілёве, затым у піярскіх вучылішчах у Дуброўне і Дабравіцах. У час вучобы ён праяўляе асаблівыя здольнасці па філасофіі, логіцы, фізіцы і мовы. З 1796 г. А. Доўгірд працуе настаўнікам у Лідзе, Шчучыне, Віцебску і іншых гарадах і мястэчках Беларусі, выкладае арыфметыку, геаграфію, фізіку, паэтыку, рыторыку, французскую мову. Адначасова ён глыбока вывучае філасофію антычнага свету — працы Арыстоцеля, Платона і новага часу — працы Бэкана, Лока, Канта, французскіх асветнікаў і інш.

У 1809 годзе таленавітага беларускага мысліцеля запрашаюць у Вільню, дзе ён спачатку працуе ў галоўнай духоўнай семінарыі, а з 1818 года чытае логіку і філасофію ва універсітэце. Дарэчы заўважыць, яго лекцыі слухалі вялікія польскія паэты А. Міцкевіч і Ю. Славацкі. Ужо ў 1814 годзе з'яўляецца першая праца вучонага «Філасофія Канта, або непрадузятае даследаванне яго сістэмы», а праз тры гады ён піша рэцэнзію на працу філосафа-кантыянца Ф. Яронскага «Аб філасофіі». Тут беларускі мысліцель выкладае свае погляды, крытыкуючы ідэалістычныя разважанні Яронскага і выступаючы прыхільнікам матэрыялістычнага сенсуалізму.

Асноўнай працай А. Доўгірда з'явіўся «Трактат аб уласцівых мысленню правілах, або логіка тэарэтычная і практычная» ў трох кнігах. Надрукавана з іх была толькі першая (дарэчы, у Полацку), а астатнія засталіся ў рукапісах. Тут распрацаваны важнейшыя праблемы логікі, у тым ліку тэорыя пазнання і яе элементы, а таксама праблемы агульнага і прыватнага, прычыны і вынікі і інш. Філосаф з матэрыялістычных пазіцый тлумачыў паходжанне адчування як уздзеяння знешняй матэрыяльнай існасці на органы пачуццяў, досыць блізка падышоў да матэрыялістычнага разумення прасторы і часу, ролі пачуццёвага і рацыянальнага ў пазнанні рэчаіснасці.

Па сваіх поглядах А. Доўгірд быў дуалістам, таму ў яго разважаннях выразна праяўляюцца непаслядоўнасць і супярэчлівасць, хістанні паміж матэрыялізмам і ідэалізмам, а яго крытыка накіравана па сутнасці толькі супраць суб'ектыўнага ідэалізму. Выказваючы шэраг матэрыялістычных палажэнняў, філосаф не здолеў правільна іх вытлумачыць. У яго працах назіраецца імкненне прымірыць навуку з рэлігіяй, у шэрагу выказванняў адчуваецца класавая абмежаванасць. Гэтыя супярэчнасці невыпадковыя. А. Доўгірд быў сынам свайго веку, калі з аднаго боку, распаўсюджваліся і авалодвалі розумам людзей ідэі асветы, а з другога — у свядомасці моцна адчувалася ўздзеянне рэлігійнага светапогляду. Таму амаль усе нават самыя перадавыя, найбольш адукаваныя прадстаўнікі тагачаснага грамадства на Беларусі і ў Літве не здолелі адмовіцца ад прызнання бога, ад рэлігійных догм.

Але для нас, у першую чаргу, важна тое, что А. Доўгірд выступаў за актыўнае пазнанне акружаючай чалавека рэчаіснасці, верыў у сілу чалавечага розуму, у яго здольнасць пазнаваць таямніцы прыроды. З матэрыялістычных пазіцый ён развіваў тэзіс, што прадметы і іх уласцівасці існуюць незалежна ад нашай свядомасці, а таму нельга атаясамліваць з імі адчуванні і ўяўленні чалавека. А. Доўгірд меў шырокі погляд на рэчы. Ён здолеў убачыць тое агульнае, што аб'ядноўвала такіх розных філосафаў-ідэалістаў, як Берклі, Юм і Платон — іх адмаўленне аб'ектыўнай рэчаіснасці матэрыяльнага свету. Каб даказаць памылковасць поглядаў англійскіх філосафаў, беларускі мысліцель звяртаўся да дакладных навук фізікі і механікі.

У сваіх працах А. Доўгірд досыць шырока паказаў заганы ідэалістычнай філасофіі. Асабліва многа ўвагі аддаваў крытыцы філасофскіх поглядаў Канта, фармалізму і схематызму яго логікі і трансцэндэнтальнай эстэтыкі, хоць, праўда, не заўважыў у працах апошняга элементаў дыялектыкі.

Значная колькасць прац А. Доўгірда засталася ў рукапісах. Гэта «Гісторыя філасофіі», «Маральная філасофія», «Курс філасофіі», «Курс логікі», працы па псіхалогіі, логіцы, натурфіласофіі і інш. У іх А. Доўгірд выказаў цікавыя ідэі аб сувязі тэорыі верагоднасці і логікі, аб структуры мовы і г. д. Іншыя яго працы яшчэ чакаюць сваіх адкрывальнікаў і даследчыкаў.

Памёр Аніёл Доўгірд у 1835 годзе.

Г. ЮРЧАНКА.

Рыгор Ігнаценка

Лісцевая замець

Абразкі

АСЕННЯЕ ЛІСЦЕ

Даўно гэта было. Памятаецца, атрымалі мы, хлапчукі, у сваёй выхаваўцельніцы новенькія, яшчэ з пахам друкарскай фарбы, буквары. Важкія такія, са стракатымі малюнкамі. Узялі ў рукі і зараз жа кінуліся гуртам у гай, які пачынаўся адразу ж за школай — збіраць лісце.

Стаяў пагодлівы асенні дзянёк. Лісце, якое асыпалася з дрэў, ціха падала на зямлю, усцілаючы яе яркім рознакаляровым дываном.

Ад маляўнічай прыроды, што акружала нас, і ад новенькіх букваро ў у кожнага з нас было столькі радасці, што мы не ведалі, куды яе падзець. Маладымі зайчанятамі мы гойсалі па гаі, ловячы падаючае з дрэў лісце, куляліся праз галовы, качаліся па зямлі. Утаймаваўшы такім чынам сваю радасць, садзіліся, каб раскласці назбіранае лісце між хрусткімі старонкамі букваро ў.

Гэта было маё першае знаёмства з асеннім лісцем, бо нейк сталася так, што да таго часу яно для мяне быццам не існавала. Я іх проста не заўважаў, як не заўважае чалавек сваёй старасці...

Далёка ў мінулае адышоў той памятны асенні дзень, а я кожную восень усё ў лес хаджу і нібы той самы бесклапотны хлапчук, усё гэтак жа асенняму лістападу радуюся. Праўда, зараз гэтая радасць трошкі інакш выказваецца. Я не бегаю, як тады, па гаі, і праз галаву, вядома, не куляюся, а проста саджуся ў лесе і маўчу.

Вось і ў гэты раз. Сядзеў я ціха на пні і любаваўся асенняй прыгажосцю.

Асенняе лісце... Колькі яго тут было на палянцы і якіх толькі колераў — цяжка апісаць. Па ўсяму было відно, што ноччу пагаспадарыў свавольнік-вецер, пераблытаў у лесе ўсе карты. Таму пад рыжым шатром каржакаватага дуба яркімі вугольчыкамі гарэлі барвовыя лісты асіны, а пад чырвонай асінай — колеру дзяругі — дубовыя, пад залацістым клёнам — бурае лісце рабіны, зеленаватажоўтае — вярбы, лімоннае — бярозы. Усё гэта і стварала тую непаўторную гаму прыгажосці, ад якой цяжка восенню ў лесе вока адвесці.

Калі я намерыўся ўжо пакінуць лес, на палянцы з'явілася сойка. Села пад чырвоную асінку, набрала ў дзюбку рознакаляровых лісцяў і, мільгануўшы казачнай жар-птушкай, знікла з вачэй.

Дзеля чаго птушцы восенню лісце спатрэбілася, цяжка сказаць. Магчыма, гэта была маладая, гарэзлівая сойка, і ёй проста захацелася пагуляць з імі, як гулялі калісьці мы, хлапчукі? А, можа, старая, навучаная жыццёвым вопытам птушка вырашыла іх узяць з сабою на далёкую чужыну?..

Што ж, усё магчыма. Радзіма — яна аднолькава ўсім дарагая як чалавеку, так і птушцы. А яна, радзіма, гэта не толькі бязмежны разліў зялёных лясоў каля твайго горада або вёскі, сінеючая стужка шырокай ракі на стракатым дыване лугавых кветак, але і адзінокі жоўты ліст бярозы, заўважаны табою на сырой асенняй зямлі ў лесе.

ДУХМЯНЫЯ ГРЫБЫ

Нарэшце з хрустам з-пад апалага лісця палез духмяны грузд.

Доўга грыбнікі чакалі гэтага шчаслівага часу. І вось ён настаў.

Пошукі груздоў маюць сваю асаблівасць. Грыбніку тут не столькі патрэбна вострае вока, колькі тонкі нюх. Гэта азначае, што грыбнік груздовыя высыпкі адшуквае не столькі на вока, колькі па нюху.

Ідзе нетаропка па лесе сівы дзядок-лесавік з кошыкам на руцэ. Ідзе і ўважліва паветра нюхае. А панюхаць зараз ёсць што ў лесе. Кіслымі журавінамі патыхаюць балотцы і азярцы, сушанымі суніцамі — сонечныя паляны і пасекі, грыбамі — лясы. Нават апалая лістота мае свой асаблівы пах, пры тым у розных месцах розны. У светлых бярэзніках пахне печанай бульбай, у дубняку — паленым жолудам, у асінніку — горкім мінда лём, прэлай яравой саломай пахнуць шэрыя алешнікі.

Многа розных пахаў у асеннім лесе трымаецца. Але грыбнік шукае свой, аднаму толькі яму вядомы.

Доўга так ішоў дзядок па лесе. Але вось ён спыніўся. Пастаяў нейкі час, панюхаў вільготнае лясное паветра і кажа:

— Груздамі запахла.

Падбадзёрыўшыся неяк адразу, ён узяў «след» і, быццам па нітцы, нетаропка пакрочыў уперад.

Шамаціць лесавік апалай лістотай, а груздовы пах ўсё мацнее. Вось пройдзена дзесятак метраў, яшчэ паўдзесятка, крок, другі і — стоп! Тонкі струмень араматычнага паху раптам шырокай хваляй разліўся па ўсім гаі.

Пад маладой бярозкай пабурэлае лісце горкай к верху прыўзнята. Дзядок тыцнуў кіем у лістоту, і з-пад яе ва ўсёй сваёй велічнасці і прыгажосці паўстаў малочна-белы грузд. Шапка — са сподачак. Крохкі, сакавіты, са здаровым халадком у белым целе. Грыб так старанна лез з-пад апалага лісця, што нават спацеў увесь.

Лесавік паклаў асцярожна трафей у кошык і пачаў далей лістоту варушыць. Грузд — грыб кампанейскі. Знайшоў адзін, шукай у гэтым месцы і другі. Яны ж, як кажуць грыбнікі, любяць сламі расці. Гэта азначае — кучна, адзін каля другога.

Патантаўся так дзядок-лесавік з гадзіну па бярозавым гаі і цэлы кошык духмяных грыбоў назбіраў.

Ідзе ён з кошыкам светлымі бярэзнікамі, і яны поўняцца духмяным пахам груздоў. Уваходзіць у стары замшэлы дубняк — і ён таксама раптам пачынае духмяніць груздамі. І куды б цяпер дзед-лесавік ні ішоў, усю дарогу яго неадступна праследуе духмяны пах груздоў у кошыку. І так — аж да самай вёскі.

ЗІМА ПРЫСПЕШВАЕ

Ноччу нечакана ўдарыў моцны мароз. К раніцы азярцы, раўчукі і лужынкі пакрыліся лядком. На лясных дарогах таксама ўсюды бялеў трашчак. Праз яго тонкую празрыстую плёнку выразна прасвечвалася яшчэ непабляклае жоўтае лісце бяроз, яшчэ зялёныя травінкі, каштанавыя шкарлупкі раздзёўбаных сойкамі жалудоў.

Я спыніўся каля невялічкага ляснога азярца. Яно таксама было зацягнена бліскучай слюдзяной плёнкай.

На беразе стаяў альховы куст. Уцалелае на ім бурае пакручастае лісце адрывалася ад галінак і, ціха шоргаючы па сучках, паволі падала ўніз. Ледзьве яно толькі краналася гладкай паверхні азярца, як яго тут жа падхоплівала ветрам. На сярэдзіне азярца лісце збілася ў кучу, і вецер круціў і круціў яго...

Адкуль ні вазьміся — шары кулічок. Кругленькі такі, пушысты, гаршнэпам завецца. Як ляцеў, так з ходу і — шлёп на лёд каля беражка. Смешна праехаў на куртатым хвосціку і, напалохана піскнуўшы, ускочыў на рыжую купіну. Паківаў збянтэжана доўгім носам, разгублена гледзячы сабе пад ногі на бліскучы лёд, потым сарваўся з месца і, тонка папіскваючы, заспяшаў на поўдзень.

Некалі адседжвацца — зіма прыспешвае.

для хутчэйшага аднаўлення бібліятэк.

Непрыкметна ідзе час. Даўно загоены раны вайны. На ніве культуры спее багаты ўраджай.

Сёння ў горадзе бібліятэк звыш пяцісот. Школьныя і дзіцячыя, раённыя і клубныя, навуковыя, тэхнічныя і бібліятэкі навучальных устаноў. На паліцах мінскіх бібліятэк сабрана велізарныя скарбы — звыш 18 мільёнаў кніг і часопісаў!

Гордасцю рэспублікі з'яўляецца Дзяржаўная бібліятэка БССР імя Леніна. Летась яна абслужыла 37 тысяч чытачоў і выдала ім адзін мільён 300 тысяч кніг. «Ленінка» — метадычны цэнтр бібліятэк рэспублікі, яе калектыў вядзе вялікую плённую работу.

Да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка расчыніць свае дзверы новы будынак бібліятэкі Акадэміі навук. У сваіх чытальных залах яна зможа прыняць пяцьсот чытачоў.

БІБЛІЯТЭКАР — душа бібліятэкі. У нас ёсць ветраны, якія літаральна на сваіх плячах узнімалі бібліятэкі з папялішчаў вайны. У нас ёсць нямала і маладых высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Сорак восем гадоў працуе на бібліятэчнай ніве Р. Любна. Многа год яна дырэктар адной са старэйшых і лепшых бібліятэк вышэйшых навучальных устаноў — Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Бадай няма ніводнага спецыяліста, які працуе ў галіне гісторыі Беларусі і беларускай літаратуры і культуры, хто не карыстаўся б парадамі і бібліяграфічнымі працамі заслужанага дзеяча культуры рэспублікі Н. Ватацы. Сябрам і дарадчыкам школьных і дзіцячых бібліятэк вось ужо шмат гадоў з'яўляецца загадчыца сектара Дзяржаўнай бібліятэкі З. Дз'яканава.

Цікавую работу ў галіне беларускай бібліяграфіі вядзе ў бібліятэцы Акадэміі навук Л. Збралевіч. Свой уклад уносяць і супрацоўнікі бібліятэкі імя Горкага. Яны былі першымі, хто пачаў бібліяграфічнае абслугоўванне партыйных і савецкіх органаў, спецыялістаў народнай гаспадаркі ў вызваленым Мінску ў 1944 годзе. З раніцы да глыбокай ночы была заўсёды на сваім пасту загадчыца бібліяграфічнага аддзела і намеснік дырэктара Е. Гурская. Вялікі вопыт актыўнага ўдзельніка калгаснага будаўніцтва ў Беларусі, веданне літаратуры па эканоміцы рэспублікі, увага да інгарэсаў чытачоў рабілі яе дапамогу вельмі актуальнай. Эстафету з яе рук прыняла галоўны бібліёграф Л. Апенгейм. Нямала спецыялістаў звярталіся да яе за дапамогаю ў росшуках літаратуры па тэхнічных і эканамічных праблемах. Разам з С. Цлаф яна з'яўляецца складальнікам бібліяграфічнага ўказальніка «Народная гаспадарка БССР».

Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ўзнагароджана загадчыца бібліятэкі Ленінскага раёна І. Арэхоўская. Можна яшчэ прыгадаць імёны вялікіх кнігалюбаў Т. Вікенскай, М. Вішнеўскай, К. Абухаўскай, Н. Юсавай, З. Хомік, Н. Усавай, Л. Васьковай, М. Масенжнік, В. Кузняцовай, П. Доўнар і інш.

За гады Савецкай улады ў рэспубліцы выраслі кадры бібліятэкараў і бібліятэказнаўцаў. Сярод іх правафланговым бібліятэчнага фронту Беларусі з'яўляецца заслужаны дзеяч культуры рэспублікі І. Сіманоўскі. Немалую ролю ў падрыхтоўцы і выхаванні бібліятэчных кадраў рэспублікі адыгрывае калектыў навуковых супрацоўнікаў бібліятэчнага факультэта Мінскага педінстытута. Сярод іх старэйшыя спецыялісты сваёй справы К. Маўрычава, М. Талкачоў, Н. Каласко.

Мы прыгадалі толькі некаторыя імёны бібліятэкараў, і няхай не крыўдуюць тыя таварышы, пра якіх у гэтым артыкуле нічога не было сказана. Іх праца не менш значная.

ЯК БАЧНА, гісторыя культуры і ў прыватнасці бібліятэк Мінска багата вялікімі і значнымі справамі. Трэба, каб работнікі культуры і іх шматлікія актывісты склалі летапіс бібліятэчнай справы ў сваім раёне, горадзе, вобласці і рэспубліцы, захавалі б імёны тых, хто аддаў сваё жыццё ў барацьбе з фашысцкімі акупантамі. Калі не мы зоймемся гэтай справай, дык хто яе за нас зробіць?

ЭКРАН РАСКАЗВАЕ ПРА РЭВАЛЮЦЫЮ

РАЗВІЦЦЁ гісторыка-рэвалюцыйнай тэмы ў савецкім кіно — складаны працэс, які вызначыў многія перамогі айчыннага і сусветнага кінамастацтва.

Рэвалюцыйная барацьба рабочага класа, героіка народных паўстанняў, падзеі Кастрычніка і бурны час грамадзянскай вайны ўжо ў пачатку дваццатых гадоў непадзельна захапілі ўяўленне маладых савецкіх мастакоў.

З таго часу гісторыка-рэвалюцыйны жанр стаў вядучым у савецкім кіно. Цікава, што найбольш значныя, наватарскія фільмы 20-х і 30-х гадоў зроблены на матэрыяле яркіх рэвалюцыйных падзей у гісторыі савецкага народа.

Кастрычніцкая рэвалюцыя, якая вызначыла карэнны паварот ва ўсіх галінах жыцця маладой Савецкай рэспублікі, здзівіла многіх кінамайстроў магутнасцю рэвалюцыйнага энтузіязму разняволеных мас.

І менавіта таму гісторыка-рэвалюцыйная тэма натхніла на творчыя пошукі, на смелыя эксперыменты Сяргея Эйзенштэйна, Усевалада Пудоўкіна, Аляксандра Даўжэнку, Дзігу Вертава і іншых мастакоў, якія сталі класікамі сусветнага экрана.

Работа пад сцягам рэвалюцыі азначала не толькі актыўнае ўтаржэнне ў багацейшы і недаследаваны гісторыка-рэвалюцыйны матэрыял. Яна патрабавала перагляду многіх застарэлых канонаў і штампаў дарэвалюцыйнага кіно. Вось чаму заснавальнікі савецкага кіно яшчэ ў гады «вялікага нямога» знайшлі мноства новых арыгінальных прыёмаў кінавыразнасці, імкнучыся да максімальнага мастацкага ўздзеяння на масавага гледача.

Пад уплывам актыўных рэвалюцыйных пераўтварэнняў у жыцці нашай краіны кіно ў першыя ж гады Савецкай улады стала магутным сродкам палітычнай асветы шырокіх мас, мастацтвам высокага гераічнага пафасу. Нездарма эмацыянальна-ўдарную магутнасць рэвалюцыйнага кінамастацтва Сяргей Эйзенштэйн назваў «кінакулаком».

Найбольш актыўна служыў справе камуністычнага выхавання мас гісторыка-рэвалюцыйны фільм, які прайшоў шлях ад прымітыўнай агіткі ў форме стужкі-плаката, стужкі-лозунга да сапраўдных вышынь сучаснага мастацтва. Нельга забываць, што лепшыя гісторыка-рэвалюцыйныя фільмы 20-х і 30-х гадоў з'явіліся ва ўмовах палемікі з буржуазным мастацтвам, і гэта ў вялікай меры вызначыла іх высокі рэвалюцыйны напал.

Савецкае кіно пачалося з хронікі. Адсюль важнейшая асаблівасць першых гісторыка-рэвалюцыйных стужак: строгая дакументальнасць, суровая прастата, вобразная публіцыстычнасць кінамастацтва. Кінаглядача заўсёды будуць хваляваць страшныя кадры расстрэлаў барацьбітоў з царызмам у «Стачцы» і «Браняносцы «Пацёмкіне» Эйзенштэйна, развод мастоў, галодныя чэргі, штурм Зімняга ў яго стужцы «Кастрычнік». Здзіўляючыя сваёй бязлітаснай бытавой праўдзівасцю карціны разрухі і голаду ў фільмах Вертава, паралельны мантаж сцэн біржы і фронту у «Канцы Санкт-Пецярбурга» Пудоўкіна, акопныя будні 1-й сусветнай вайны ў фільме Барнета «Украіна».

Большасць гісторыка-рэвалюцыйных карцін 20-х і 30-х гадоў былі далёкія ад імкнення «падгрыміраваць» факты гісторыі. Здымаючы «Кастрычнік», Эйзенштэйн у многіх дэталях следаваў успамінам ветэранаў і відавочцаў рэвалюцыі, якія прымалі непасрэдны ўдзел у рабоце над фільмам.

Неабходна сказаць, што на змест першых гісторыка-рэвалюцыйных фільмаў вядомы станоўчы ўплыў аказаў рэжысёр-дакументаліст Дзіга Вертаў. На экране побач з вопытнымі акцёрамі, і нярэдка ў галоўных ролях, з'явіўся тыпаж-чалавек, падабраны рэжысёрам па вонкавых рысах і па ступені ўнутранай адпаведнасці герою.

Бліскучыя прыклады выкарыстання тыпажу мы знаходзім у масавых сцэнах, знятых Эйзенштэйнам, Пудоўкіным, Даўжэнкам. На ўсё жыццё запамінаецца гледачу славуты персанаж «Браняносца «Пацёмкіна» — урач Смірноў, якога «сыграў» істапнік севастопальскай гасцініцы. В. Пудоўкін у сваёй цудоўнай экранізацыі рамана Горкага «Маці» (1926) здолеў аб'яднаць выразнасць тыпажоў і мастацтва акцёрскай ігры.

У 20-я гады развіццё гісторыка-рэвалюцыйнага фільма вызначала перш за ўсё эпічная, манументальная карціна, у якой фігурыравала маса — герой.

У такіх стужках, як правіла, не было глыбокай індывідуалізацыі характараў персанажаў. Але гэта нельга ставіць у папрок майстрам манументально-гераічнага напрамку. Бо яны засяроджвалі сваю думку на адлюстраванні народа як творцы гісторыі, а такі падыход патрабаваў наватарства ў пастаноўцы масавых сцэн, стварэння ёмістых абагуленых вобразаў рэвалюцыянераў, умення перадаць дух пралетарскага калектывізму.

Менавіта гэтага ўдалося дамагчыся Эйзенштэйну ў «Стачцы», «Браняносцы «Пацёмкіне», «Кастрычніку». Нядаўна італьянскі рэжысёр Нані Лой, зыходзячы з вопыту савецкага кіно, стварыў фільм «Чатыры дні Неапаля»; у гэтай карціне ўвага мастака прыкавана да масавых сцэн, якія паказваюць нарастанне народнага гневу ў агні паўстання супраць гітлераўцаў.

Сярод гісторыка-рэвалюцыйных фільмаў 20-х гадоў асобае месца займала карціна Аляксандра Даўжэнкі «Арсенал». Яна вылучалася смеласцю паэтычных вырашэнняў, своеасаблівасцю і сілай рэвалюцыйна-рамантычнага духу. Мастак не баяўся ні смелага дамыслу, ні вострай гіпербалічнасці вобразаў, імкнучыся пасвойму данесці вялікую праўду рэвалюцыі. Хрэстаматыйна вядомыя метафарычныя кадры фіналу: кулі гайдамакаў не могуць скасіць рабочага-арсенальца Цімоша, які з адкрытымі грудзьмі стаіць перад сваімі ворагамі.

У гэтых умоўных кадрах абагульненне дасягае мяжы. Даўжэнка гаворыць аб неўміручасці рабочага класа, аб магутнасці і незнішчальнасці рэвалюцыі.

Але ў тыя гады былі створаны цікавыя творы гісторыка-рэвалюцыйнай псіхалагічнай драмы, у якой вырашэнне вострых драматычных канфліктаў патрабавала, у асноўным, глыбокага акцёрскага пранікнення ў псіхалогію героя.

Такія «Начны рамізнік» Тасіна, «41-ы» Пратазанава. Характэрна, што ў фільме «Маці» драматург Натан Зархі без шкоды для рамана М. Горкага ўзмацніў элементы драмы, прыдумаўшы шмат новых сюжэтных сітуацый і змяніўшы фінал.

Пачатак новага прагрэсіўнага этапу ў развіцці гісторыка-рэвалюцыйнай тэмы звязана з нараджэннем гукавога кіно.

У 30-я гады на экране суіснавалі, праўда, не без палемікі, манументальнае, гераічнае тлумачэнне рэвалюцыйных падзей і камерны падыход да іх, які патрабаваў вялікай глыбіні ў раскрыцці чалавечага характару.

Героіка-эпічны стыль і рэвалюцыйна-рамантычная патэтыка карціны Усевалада Вішнеўскага і Яфіма Дзігана «Мы з Кранштата», як яркі калектыўны герой бяруць пачатак ад неўміручага «Браняносца «Пацёмкіна». Прыкладам іншага тлумачэння гісторыка-рэвалюцыйнай тэмы можа служыць самабытная і лірычная «Украіна» Барыса Барнета. Яе рэвалюцыйнаму пафасу зусім не перашкаджала ні багацце гумару, ні сакавітасць бытавых замалёвак. Фільм проста і праўдзіва апавядае пра тое, як пад уплывам рэвалюцыйных падзей мяняецца жыццё глухой і сумнай дарэвалюцыйнай правінцыі.

Юлій Райзман і Яўген Габрыловіч у «Апошняй ночы» таленавіта паказалі эпізоды рэвалюцыйных падзей у Маскве. Мастакі наследуюць лепшыя традыцыі псіхалагічнай драмы, сутыкаючы лёсы прадстаўнікоў дзвюх сем'яў. Сярод мноства гісторыка-рэвалюцыйных фільмаў 30-х гадоў рашаючае значэнне мелі стужкі, у якіх на шырокім фоне рэвалюцыйнай барацьбы даваліся жывыя і паўнакроўныя характары стваральнікаў і ўдзельнікаў рэвалюцыі. Рабочы Максім, народныя палкаводцы Чапаеў і Шчорс, салдат Іван Шадрын, прафесар Паляжаеў у праслаўленых фільмах захаплялі ўяўленне савецкага гледача. Цэнтральны герой гэтых карцін, дадзены як непаўторная чалавечая індывідуальнасць, адлюстроўваў у той жа час тыповыя рысы ўсяго савецкага народа.

З'яўленне фільмаў Міхаіла Рома аб Леніне («Ленін у Кастрычніку» — 1937 г. і «Ленін у 1918» — 1939 г.) было заканамерным вынікам многіх дасягненняў савецкіх гісторыка-рэвалюцыйных стужак.

Пад канец 30-х гадоў склаўся жанр біяграфічнага фільма аб буйных дзеячах рэвалюцыі. Пасля Чапаева, Шчорса і ленінскіх фільмаў на экраны выйшлі «Якаў Свярдлоў» Сяргея Юткевіча (1940), «Катоўскі» Аляксандра Файнцымера (1943), «Аляксандр Пархоменка» Леаніда Лукава (1942) і г. д.

На студыях нацыянальных савецкіх рэспублік былі створаны ў 30-я гады такія таленавітыя рэчы, як «Зангезур» Бек-Назарава, «11 ліпеня» Тарыча, «Апошні маскарад» Чыаурэлі.

Так званы перыяд «малакарціння» (канец 40-х — пачатак 50-х гадоў) не прынёс поспеху гісторыка-рэвалюцыйным фільмам, але ў другой палавіне 50-х гадоў гісторыка-рэвалюцыйныя фільмы набываюць яркую грамадзянскасць, страсную партыйнасць і псіхалагічную глыбіню ў абмалёўцы станоўчага героя рэвалюцыі. У большай меры, чым іншым кінатворам, гэтыя рысы ўласцівыя фільму Юлія Райзмана «Камуніст».

Апошняе дзесяцігоддзе ў развіцці савецкага кінематографа адзначана поспехам такіх стужак аб рэвалюцыі, як «Сорак першы» Рыгора Чухрая, «Аптымістычная трагедыя» Самсона Самсонава. Апошні фільм атрымаў спецыяльны прыз у Канах «За найлепшае ўвасабленне рэвалюцыйнай эпапеі».

Фільмы аб рэвалюцыі сталі магчымыя і ў форме сатырычнай камедыі. У «Вялікай дарозе» Юрыя Озерава многія падзеі дзевяны вачыма галоўнага героя — чэшскага пісьменніка Яраслава Гашака. Экран гаворыць з гледачом свабодна і раскавана, вабячы яго і нечаканымі пераходамі ад смешнага да сур'ёзнага, і тонкім выкарыстаннем прыёмаў палітычнага памфлета, і гераічнымі старонкамі грамадзянскай вайны.

У апошнія гады савецкі гледач убачыў у кіно новыя і больш глыбокія псіхалагічныя акцэнты ў абмалёўцы Ул. І. Леніна. «Апавяданні пра Леніна» Сяргея Юткевіча, «Сіні сшытак» Льва Куліджанава даюць нам шматгранны ўнутраны партрэт Ільіча. Рух магутнай ленінскай думкі перададзены ў чалавечнасці мары правадыра, у яго цяжкай рабоце над рукапісам, у яго цярплівай палеміцы з ідэйнымі праціўнікамі па партыі і паэтычным успрыняцці любімай прыроды. Выпушчаная ў 1966 годзе карціна Юткевіча і Габрыловіча «Ленін у Польшчы» вырашана як фільм-маналог, дзе тонкі выяўленчы змест і закадравы ленінскі голас малююць складаныя шляхі роздуму Уладзіміра Ільіча.

Гісторыка - рэвалюцыйныя фільмы апошніх гадоў усё часцей набываюць характар глыбокага даследавання жыцця: у іх шмат спроб убачыць мінулае вачыма нашага сучасніка. І ў гэтым плане гісторыка-рэвалюцыйны жанр усё больш і больш прыцягвае ўвагу маладых савецкіх кінематаграфістаў.

Аляксей БЕРНШТЭЙН,
кіназнаўца.
(АДН).



РАЎНАВАГА.

Фотаэцюд Л. КЛІМАВА.
З работ, прысланых на выстаўку «Беларусь-фота-67».

ГУМАР НАШЫХ СЯБРОЎ

Рамуальд ЛЕНАХ

МУЗА

Ужо больш як пяць гадзін я бедаваў і круціў галаву над тым, як найлепш і канчаткова вырашыць сваю мастацкую задуму. Майстэрня ўся прапахла фарбамі.

— Цяпер не тое, што было даўней, — горка разважаў я, — налі мастак меў сваю музу, якая натхняла яго. Варта было, каб яна цмокнула ў лоб, і майстар адразу ведаў, што рабіць. А сёння... — І я ўжо замахнуўся нагою, каб перавярнуць раму з палатном.

— Я тут, — ціха шапнула маладзенькая муза, усміхнулася і прычыніла за сабою дзверы. — Тут, мусіць, майстэрня, калі не памыляюся?

Замест таго, каб адказаць на пытанне, я моўчкі працягнуў рукі да музы і ўпіўся ў яе вачамі.

— Божа, — шапнуў я сам сабе.

— Можна бліжэй? — загучала цёплае сапрана.

— Канечне ж, можна, — адказаў я, не помнячы сябе ад радасці, і, узяўшы яе за рукі, падставіў свой лоб.

Чароўная дзяўчына з Алімпа з незвычайнай прастатой надарыла мяне пацалункамі, а звыш прадугледжанага цмокнула яшчэ і ў шыю.

— Ты — проста цуд, — сказаў я ў захапленні, — казачная і разам з тым такая сучасная. — Я зірнуў на яе ножкі пад кароценькай спаднічкай.

— Дай што-небудзь выпіць, — зусім па-свойму папрасіла муза.

— Табе, пэўна, амброзія патрэбна... або нектар, — засмуціўся я. — Але ж я...

— Марачнае віно мне шкодзіць. Лепш чыстая экспартная гарэлка альбо французскі каньяк.

Пасля таго, як муза адным дыхам апаражніла шклянку мацаку, які мне ўдалося прыхаваць ад сяброў, нечаканая госця акінула позіркам маю майстэрню:

— Тут так светла...

— Гэта нішто ў параўнанні з тваім святлом, якое будзе натхняць мяне на новыя пошукі, — сказаў я. — Наплачуцца мае канкурэнты, а я на чарговым біенале напэўна некальні медаляў схаплю.

— Цудоўна, — усміхнулася муза, прыклаўшы пальчык да вуснаў, і шмыгнула за падраную занавеску, якою была прыкрыта печ з электраплітай. — Ну, дык я распранаюся.

Маланкай у мяне перад вачамі прабеглі музы, якіх я бачыў на антычных малюнках у класічнай прастаце форм, без непатрэбнага ўбранства.

— Вядома ж, — згадзіўся я, — распранайся.

— А ты тым часам падрыхтуй рэфлектары і ўстанаві камеру.

— Навошта рэфлектары? І так светла. І якую камеру?

— Фотакамеру, — прамовіла цвёрдым голасам муза. — Ты ж абяцаў мне па тэлефоне, што дасі дзесяць злотых за позу, і што я траплю на вокладку замежнага ілюстраванага часопіса або ў фільм. А цяпер нешта пляцеш. Ну дык як?

— Фотакамеру? — усміхнуўся я меланхалічна. — Гэта паверхам вышэй, там майстэрня фатографа Тапіляка. Вы памылілася.

— Памылілася? — сыкнула, як гадзюка, муза. — Не мог сказаць раней, што ты маляр!

А потым яшчэ больш злосна дадала:

— А распранацца загадаў!

Пераклаў з польскай мовы
М. КЛЫШКА.

Саме прыемнае ў нашай рабоце, што самі мы ніколі не глядзім сваіпраграму.

Мал. Гэдона МІКЛАШЭЎСКАГА.
З часопіса «Польскі вгляд».

Здэнек СЕЙДЛ

АФАРЫЗМЫ

Піючая машынка хвалілася: «Я ведаю і фізіку і матэматыку, кінасцэнарыі для мяне — дробязь, а якіяцудоўныя вершы я пішу!»

□

«Ўлавей, — спытала жаба, — дзе мне так навучыцца спяваць, як ты? Грошай у мяне хопіць, ды і суязі ёсць».

□

Увесь час глядзеў у неба і ўсё танізіраваў у бездань.

□

Зб з залатой каронкай пацяшаўся са здаровых, якія яму зайздрасцілі: «Бачыце, ха-ха, вы ж несапаваныя!»

□

Плка вельмі саромелася, калі гасадар біў ёю сабаку.

□

Пчуццё сказала розуму: «Ведаешся больш не магу!» «А, думаеш, я магу?» — адказаў розум.

□

Сменне — рэха былога вопыту.

□

Нкаторыя ўсё жыццё жывуць з завязанымі вачамі і заткнутымі вушмі, як бутэлька, якую ніхто не дкаркаваў.

□

Бзглуздзіца ведае адно — мазалў на языку не бывае.

□

Біў сумны, як студня без вады.

□

Сыталі вочы ў вушэй, што яны люяць слухаць болей за ўсё. «Болейза ўсё мы любім цішыню», — адказалі вушы.

З чэшскай мовы пераклаў
А. МАЖЭЙКА.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ За рубяжом

«МАКБЕТ» У СУЧАСНЫМ КЛЮЧЫ

Італьянскія кінематаграфісты рыхтуюць два фільмы па матывах шэкспіраўскай «Макбет». Яны не будуць простым паўтарэннем трагедыі вялікага драматурга. У гэтых фільмах па задуме іх стваральнікаў будзе перададзена ў сучасных умовах асноўная сюжэтная лінія і характары, намаляваныя Шэкспірам. У адным фільме, які будзе здымаць Лукіна Вісконці з удзелам Марчэла Мастраяні і Ванесы Рэдграў, Макбет будзе багатым заходнегерманскім прамыслоўцам, а яго жонка — халоднай, разліковай, гатовай на любое злачынства жанчынай. У другой версіі, якую рыхтуе Джанкарла Дзаны з удзелам французскага кінаартыста Робера Осейна і амерыканкі Кэрол Бэйкер, дзеянне будзе разгортвацца ў асяроддзі буйных швейцарскіх фінансістаў. Сучасны Макбет, дырэктар прыватнага банка, праводзіць фінансавую афёру, якая забяспечвае яму перамогу над канкурэнтамі. Але гэтага яму здаецца мала. Ненажэрная прага нажывы і ўлады не дае яму спакою. Падбухторваемы жонкаю, ён становіцца на шлях злачынстваў. Справа канчаецца духоўным і фізічным крахам абаіх. Мараль фільма простая — яе ў наступных словах вызначыў сам аўтар Дзаны: «У нашы дні столькія рвуцца залезці на ступеньку вышэй, топчучы законы сумлення і маралі». Фільм так і будзе называцца «На ступеньку вышэй».

Юрый ЛАПАЦІН,
карэспандэнт ТАСС.

Рым.

ЛЮБІМЫЯ КІНААКЦЁРЫ ФРАНЦЫІ

Мішэль Морган і Жан Габен застаюцца самымі любімымі кінаакцёрамі Францыі. Аб гэтым гаворыць вынікі апытання, праведзенага французскім інстытутам грамадскай думкі (ФІГД), які перакладае на мову лічбаў такія катэгорыі, што, здавалася б, не паддаюцца дакладнаму ўліку, як слава і папулярнасць.

Месцы сярод актрыс размеркаваліся наступным чынам: Мішэль Морган (36 галасоў са 100 апытаных), Брыжыт Бардо (18), Жана Маро (14), Даніэль Дар'е (9), Эдвіж Феер (3), Сімона Сіньёрэ (3), Анні Жырардо (2) і г. д.

Сярод акцёраў: Жан Габен (41), Бурвіль (18), Фернандэль (17), Жан Марэ (10), Ж.-П. Бельмонда (8), Луі дэ Фюнес (4), П'ер Фрэнэ (4), Ален Дэлон (4), Мішэль Сімон (3), Ів Мантан (2)...

Анкета сур'ёзнага ФІГД, у далядасці вынікаў якой можна быць упэўненым, прынесла шмат сюрпрызаў як прафесіяналам, так і аматарам кіно. Высветлілася, што Мішэль Морган, якая рэдка здымаецца ў апошнія гады, у сэнсе папулярнасці дае «шмат ачкоў наперад» Брыжыт Бардо, партрэты якой не сыходзяць з першых старонак тутэйшых газет. Значна ўзнялася папулярнасць Жана Габена (які займаў, зрэшты, і ў мінулым ганаровым спісе першае месца) і камедыйнага кінаакцёра Бурвіля.

Юрый ПАНАМАРОЎ,
карэспандэнт ТАСС.

Парыж.

НОВЫ ФІЛЬМ ПІТЭРА УОТКІНСА

Пітэр Уоткінс пачаў сваю дзейнасць кінарэжысёрам на тэлебачанні. У кампаніі Бі-Бі-Сі ён паставіў фільм, прысвечаны бітве паміж англічанамі і шатландцамі ў XVIII стагоддзі пад Куладанам. На думку крытыкі, на экране тэлевізара яшчэ ніколі не паказвалі такога рэалістычнага фільма.

Сусветную вядомасць Уоткінсу прынёс фільм «Ваенныя манеўры», створаны ім таксама для тэлебачання. Трэба сказаць, што Бі-Бі-Сі адвергла фільм, палічыўшы яго занадта «хвалюючым». Таму «Ваенныя манеўры» выйшлі на экраны кінатэатраў і ўславілі пастаноўшчыка.

У цяперашні час Уоткінс стварыў свой трэці, таксама вельмі цікавы фільм «Прывілей» па сцэнарыі Нормана Богнера, які паклаў у аснову сцэнарыя кароценькае апавяданне Джона Спейта.

У фільме раскрываюцца метады, да якіх прыбягаюць кіруючыя колы, каб прывязаць моладзь да існуючага ладу. У аснове сюжэта фільма — камерцыйная эксплуатацыя спевака — выканаўцы «поп»-песенек — Пітэра Шортэра, якога цудоўна іграе спявак Поль Джонс. Гэты няшчасны хлопец — герой фільма — быў «адкрыты» і антрэпрэнёрам і яго памочнікамі. Усе яны нажываюцца на ганарарах, якія атрымлівае Шортэр, кантралююць і кіруюць кожны яго крок. Ён адзінокі і зусім збіты з панталыку, не ведае, як яму вырвацца з гэтых путаў.

У разгар славы Шортэра, калі яго выступленні збіраюць дзесяткі тысяч гледачоў, урад, царква і вялікі бізнес рашаюць выкарыстаць у сваіх мэтах папулярнасць гэтага хлопца. Яны хочуць абудзіць моладзь падтрымліваць устаноўлены лад жыцця, які прыносіць «прывілеі» ўсім, хто стаіць ва ўладзе. Пачынаецца масавая кампанія пад назваю «Хрысціянскі крыжовы паход». У гэтым мерапрыемстве Пітэру Шортэру адведзена наступная роля — ён павінен спяваць «пакаянныя песні» і «поп»-варыянты рэлігійных гімнаў. Моладзь, якая вельмі любіць Шортэра, следуючы яго прыкладу, у абстаноўцы масавай істэрыі, што нагадвае аборышчы ў Нюрнбергу, пачынае ў песнях прызнаваць аўтарытэт царквы.

Агенты па рэкламе, бізнесмены, царкоўнікі, палітычныя дзеячы ў захапленні. Але... яны ўпусцілі з поля зроку самае галоўнае — асобу Шортэра, якога ўсё больш гідзіць тая ілжывая пустая роля, якую ён вымушаны іграць. Заахвочваемы сваім адзіным сапраўдным сябрам — мастачкаю, якая піша яго партрэт (гэтую ролю цудоўна іграе Джын Шрымптан), ён адмаўляецца працягваць гэтую агідную ігру. Шортэр пакідае сцэну, і «Хрысціянскі крыжовы паход» зрываецца.

У большасці крытыкаў — адпаведна настроеных — фільм выклікаў варожую рэакцыю. «Дрэнны фільм», «няўдача», «расчараванне» — вось выкарыстаныя імі эпітэты.

Аднак у англійскім друку была выказана і іншая думка. Вядомы крытык тэатра і кіно Пенелопа Гіліат прысвяціла фільму Уоткінса амаль палавіну старонкі ў газеце «Обсервер». Яна назвала яго «вельмі ўражлівым фільмам».

У фільме «Прывілей», піша яна, «ставяцца пытанні, якія, па сутнасці, трэба было ставіць палітычным дзеячам, але яны ніколі гэтага не робяць». Яна дае высокую ацэнку рабоце аператара і заяўляе, што ў фільме адзін з самых разумных тэкстаў, якія ёй калі-небудзь даводзілася чуць.

Ніна Хібін у газеце «Морнінг стар» адзначае, што гэты фільм мае «такую сілу і так хвалюе, што большасць іншых фільмаў здаюцца ў параўнанні з ім бледнымі і трывіяльнымі».

Улады цудоўна разумеюць сілу новага твора Уоткінса. Пракатныя фірмы аб'явілі, што фільм будзе паказаны толькі ў «выбраных» кінатэатрах, інакш кажучы, у васьмі з некалькіх соцень. «Морнінг стар» заклікае сваіх чытачоў бамбардзіраваць мясцовыя кінатэатры патрабаваннямі паказаць гэты фільм.

Пэт ГРЭГАРЫ,
карэспандэнт ТАСС.

Лондан.

ПАМЯЦІ НАСТАЎНІКА

На 76-м годзе жыцця пасля цяжкай хваробы памёр першы педагог першага музычнага вучылішча Беларусі саліст аркестра тэатра оперы і балета, дацэнт Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Ян Іосіпавіч Сцягенны.

Ян Іосіпавіч прыехаў у Мінск у 1924 годзе пасля заканчэння Маскоўскай кансерваторыі (клас праф. Ф. Эверта). У гэты час у Мінску якраз адкрыўся Беларускі дзяржаўны музычны тэхнікум. Валторна была новым інструментам для хлапчукоў, якія з вёсак з'ехаліся ў сталіцу. Ян Іосіпавіч прыклаў нямала намаганняў, каб не толькі навучыць нас ігры на інструменце, але і зрабіць нас культурных, адукаваных людзей. Настаўнік рос разам з выхаванамі, з ростам музычнай культуры сваёй рэспублікі. Ён стаў салістам аркестра, калі быў адкрыт тэатр оперы і балета, а потым і выкладчікам кансерваторыі.

Выхаванцаў Сцягеннага вы сустрэнеце сёння ва ўсіх аркестрах Беларусі, у аркестрах Масквы, Ленінграда, Кіева, у многіх музычных навучальных установах краіны.

Ян Іосіпавіч быў чалавекам чыстай, прыгожай душы, і ўсе мы, яго вучні, звалі яго родным бацькам.

Светлае імя Яна Іосіпавіча Сцягеннаа застанецца ў гісторыі беларускай музычнай культуры.

Адам РУСАК.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

12 верасня

Першая праграма. 16.30 — праграма перадач. 16.35 — «Падзеі дня». Выпуск навін. 16.40 — Дні Украінскай ССР у Маскве (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — «Сіла, якая пераўтварае свет». Да 100-годдзя з дня выхаду ў свет I тома «Капіталу» К. Маркса. Рэпартаж з Музея Маркса і Энгельса (М). 18.50 — «Фро» Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі «Ленфільм» (М). 19.35 — «Летапіс паўвеку». Тэлевізійны шматсерыйны дакументальны фільм. «Год 1933-ці» (М). 20.30 — тэлевізійныя навіны (М). 21.00 — «Партызанская балада». Расказ пра новую праграму Беларускага дзяржаўнага цырка. 21.30 — М. Баран і А. Ваксер. «Адно толькі слова». Спектакль Беларускага тэлебачання.

Другая праграма. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — да 50-годдзя Савецкай улады. «100 ударных дзён». Рэпартаж з Мінскага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. 18.40 — дзіцячы экран. «Джунглі, якія побач». Навукова-папулярны фільм. 19.00 — у свеце навукі. «На мяжы жыцця». Навукова-папулярны фільм. 19.50 — «Гяз і правілы для вас». «Сумная гісторыя». Крымскі нарысы. 20.00 — рэклама, аб'явы. 20.10 — «Красная плошча». Дакументальны фільм. 21.15 — канцэрт савецкай песні (М). 22.00 — «Інтэрнацыяналісты». Перадача пра румынскіх інтэрнацыяналістаў — удзельнікаў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны (М). 22.30 — «Крымскі запаведнік». Тэлевізійны фільм (М).

13 верасня

Першая праграма. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — «Падзеі дня». Выпуск навін. 17.05 — для малышоў. Знаёмства з кніжкай. Іенс Сігсгард. «Пале адзін на свеце». 17.20 — «Штрыхі да вялікага партрэта». Ілюстрацыі Н. Жукава да нігі ўспамінаў сучаснікаў пра К. Іаркса і Ф. Энгельса (М). 17.45 — д 50-годдзя Савецкай улады. «Арэны рэспублікі». Пра гісторыі развіцця аўтадарог БССР. 18.0 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — «Бессмяротная кніга». Да 100-годдзя з дня выхаду ў свет I тома «Капіталу» К. Маркса. 19.00 — Дні Украінскай ССР у Маскве. Канцэрт (М). У перапынку тэлевізійныя навіны (М). 21.30 — Дні Украінскай ССР у Маскве. Праграма Украінскага тэлебачання (М).

Другая праграма. 17.45 — «Музычны маяк» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «На мерыдыянах Украіны». Перадача з Кіева. 19.00 — «Размова ля кніжных паліц». Сустрэча з чытачамі і работнікамі бібліятэкі «Юнацтва». 19.30 — фестываль тэлевізійна-рэвалюцыйных фільмаў «Залп «Аўроры». Мастацкі фільм.

14 верасня

Першая праграма. 16.10 — праграма перадач. 16.15 — «Падзеі дня» Выпуск навін. 16.20 — школьная фільматэка. «Бацькі і дзеці». Мастацкі фільм. 18.10 — тэлевізійныя навіны. 18.30 — «Стагоддзе «Капіталу». Перадача прысвячецца 100-годдзю з дня выхаду ў свет I тома «Капіталу» К. Маркса (М). 19.10 — «Сельскі леснік». 19.30 — «Летапіс паўвеку». Тэлевізійны шматсерыйны дакументальны фільм. «Год 1934-ы» (М). 20.30 — тэлевізійныя навіны (М). 1.05 — «Год як жыццё». Мастацкі фільм. Першая серыя (М). 22.30 — «Музычны маяк» (М).

Другая праграма. 16.50 — для дзяцей. Да 50-годдзя Савецкай улады. Тут здзяйснялася рэвалюцыя» Кватэра-музей Ул. І. Леніна. Перадача з Ленінграда. 17.20 — рэвалюцыйны марш навукі. «Ізатопная хімія». Выступленне акадэміка А. П. Вінаградава (М). 17.40 — «Вясновае вяселле». Перадача з Адэсы. 18.00 — тэлевізійныя навіны (І). 18.20 — «Музычны маяк» (М). 8.30 — дзіцячы экран. «Царэўна-жаба». Мультыплікацыйны фільм. 19.10 — «Чакене». Тэлевізійны фільм Свярдлоўскай студыі (М). 9.30 — рэклама, аб'явы. 19.40 — «Грэшны анёл». Мастацкі фільм.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. ВУРАЎКІН (намеснік галоўнага рэдактара), А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН А. М. КЛІШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

Калектыў супрацоўнікаў Інстытута літаратуры імя Я. Купалы Акадэміі навук БССР смуткуе з прычыны заўчаснай смерці навуковага супрацоўніка Інстытута Гарэцкага Ігната Ільіча і выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856.

Друкарня выдавецтва «Звязда».

АТ 13622

ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВА Ў КІРГІЗІІ

Пачаўся першы набор студэнтаў у Кіргізскі дзяржаўны інстытут мастацтва. Новая, дзевятая па ліку, вышэйшая навучальная ўстанова рэспублікі арганізавана ў адпаведнасці з пастановаю Савета Міністраў СССР. Карэспандэнт АДН папрасіў пракаментаваць гэтую падзею міністра культуры рэспублікі Кулуйпу Кандучалаву.

— Вядома, які сапраўды бліскучы шлях ад адсталасці да вяршынь ведаў і культуры прайшоў кіргізкі народ за паўвекавую гісторыю свайго развіцця ў дружнай сям'і савецкага народа, — сказала Кулуйпа Кандучалава. Нацыянальная пісьменнасць, тэатральнае мастацтва, музыка, балет, жывапіс, кіно, літаратура — усё гэта мы набылі дзякуючы дапамозе ўсіх савецкіх народаў пасля перамогі Вялікага Кастрычніка.

Цяпер, у сувязі са стварэннем спецыяльнага інстытута, рэспубліка атрымала новыя магчымасці для далейшага росту нацыянальнай мастацкай інтэлігенцыі. Інстытут мастацтва будзе рыхтаваць выкладчыкаў музычных вучылішчаў, салістаў оперы, артыстаў эстрады, канцэртмайстраў, салістаў сімфанічных і народных аркестраў, кампазітараў, музыказнаўцаў, а таксама кіраўнікоў культурна-асветных устаноў — заводскіх і сельскіх клубаў і палацаў культуры. У інстытуце будзе два факультэты: выканаўчы і культурна-асветны. На кожным з іх па некалькі аддзяленняў.

Заняткі ў новым інстытуце пачнуцца 1 кастрычніка. У гэты дзень за вучэбныя сталы аўдыторый сядуць першыя сто студэнтаў. У большасці гэта выпускнікі музычных вучылішчаў рэспублікі.

ПЕРАД ПАДНЯЦЦЕМ ЗАСЛОНЫ

У калектыве Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа стала добрай традыцыяй перад пачаткам новага тэатральнага сезона выязджаць на гастролі да сельскіх працаўнікоў. Нядаўна ён адправіўся ў сваё чарговае турнэ па Полацкаму, Міёрскаму і Браслаўскаму раёнах.

Коласаўцы пакажуць свае работы «Шчыт і меч», «З каханнем не жартуюць», «Часовы жыхар».

А на сцэне тэатра ў гэты час выступае калектыў Рыжскага тэатра юнага гледача імя Ленінскага камсамола, які ўпершыню прыехаў на гастролі ў Віцебск.

БЕЛТА.

ВЯСЕЛЫ КАРАНДАШ

П А Р А Г Р Ы Б Н А Я


КАРТА